В.С.Варапаева

3

Т.С.Куцанава

# Літаратурнае чытанне



В.С.Варапаева, Т.С.Куцанава

# Літаратурнае чытанне

Падручнік для 3 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з рускай мовай навучання

*Зацверджана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

SLOVO.WS



Мінск
«Мастацкая літаратура»
2007

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

УДК 821.161.3.09(075.2=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я71
В18

Рэцэнзенты:

дацэнт кафедры беларускай мовы і методыкі яе выкладання факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка кандыдат педагагічных навук *В. І. Свірыдзенка*;
метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў сярэдняй школы № 97 г. Мінска (настаўнік вышэйшай катэгорыі *А. В. Бясчастнава*)

SLOVO.WS

Умоўныя абазначэнні:

? — пытанні і заданні да тэкстаў;

! — абагульняючыя пытанні і заданні да раздзелаў;

📖 — слоўнік.

**Варапаева, В. С.**

В18 Літаратурнае чытанне : падручнік для 3-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / В. С. Варапаева, Т. С. Куцанава. — Мінск : Маст. літ., 2007. — 128 с. : іл.

ISBN 978-985-02-0920-7

© Варапаева В. С., Куцанава Т. С., 2007
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2007

все учебники на www.slovo.ws

# З крыніц народных...

Мір,
Радзіма,
мама —
усяму аснова.
Мір,
Радзіма,
мама —
нам святыя словы.
Замяніць і страціць
нельга, немагчыма
першыя паняцці:
мама,
мір,
Радзіма.

*Васіль Жуковіч*
*НЕЗАМЕННАЕ*





все учебники на www.slovo.ws

# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСНІ

## Адкуль песня беларуская

*Легенда*

Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы ды яшчэ паўдня. Прытаміліся. Прыселі. Раптам чуюць — спявае нехта. Прыслухаўся першы:

— Відаць, жаваранак.

— Не,— кажа другі,— гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

— Ды гэта ж зямля наша спявае.



## АБРАДАВЫЯ ПЕСНІ

У кожнай пары года ёсць свае святы. На святах людзі весяляцца, спяваюць песні. Песні звязаны з рознымі з’явамі прыроды і жыцця людзей у зімовы, вясновы, летні і асенні час.



все учебники на www.slovo.ws

## ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

У жніўных песнях расказваецца пра тое, як працавалі ў полі, як збіралі ўраджай і праслаўлялі яго.

### Жніўная

Гаварыла ядранае жыта:
— Не магу я ў полі стаяці,
Каласочка дзяржаці,
Толькі магу я стаяці
У полі капамі,
У гумне стагамі,
У клеці карабамі,
А на стале пірагамі.



Г у м н о́ — будыніна для складвання і абмалоту збожжа.

К а п а́ — снапы, складзеныя адзін да аднаго конусам.

К л е ц ь — будыніна для захавання збожжа.

Я д р а н а е — *тут*: буйное, спелае.



все учебники на www.slovo.ws

1. Прачытайце жніўныя песні. Пра што ў іх гаворыцца?

2. Ці падобныя гэтыя песні? Чым?

3. Да каго звяртаецца жыта ў першай і другой (змешчанай на форзацы) песнях? Прачытайце.

4. Знайдзіце ў тэксце словы, з якімі жыта звяртаецца да жнеек.

5. Чаму сярпы называюцца залатымі?

6. Хто і як ставіць жыта ў копы, у стагі, пячэ з мукі пірагі?

7. Як трэба чытаць гэтыя песні: у хуткім тэмпе ці павольна, напеўна? Чаму?

SLOVO.WS

### Загадкі

Ледзь вецер разгуляецца —
Яно закалыхаецца,
Шуміць вакол, хвалюецца...
А хлебароб любуецца.

Улетку вырастае, а ўвосень ападае.

Адно кінуў — цэлую жменю ўзяў.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ

Пра восеньскую працу і прыход новай пары года спяваецца ў восеньскіх песнях.

### Восень мая, восень...



— Ой, восень мая,
Восень сцюдзёная,
Чаго ты рана захаладала?
— Я й не раненька,
Я й не позненька,—
Калі мая пара прыйшла:
Лісточак апаў, зямельку ўслаў,
Вось мая і пара прыйшла.
Рэчкі сталі, пазамярзалі,
Вось мая і другая пара.

slovo.ws

? 1. З якім пытаннем звяртаюцца да восені?

2. Знайдзіце ў тэксце і прачытайце адказ восені.

3. Пра якія свае дзве пары гаворыць восень?

4. Як можна назваць першую пару восені? Другую?

5. Назавіце прыкметы ранняй і позняй восені.



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws



## ЗІМОВЫЯ ПЕСНІ



Самыя вясёлыя святы, якія адзначаюцца зімой,— Новы год, Каляды і Масленіца. З гэтымі святамі нашы продкі звязвалі свае надзеі на шчаслівае жыццё ў новым годзе, на багаты ўраджай, на дабрабыт сям'і. Калядоўшчыкі хадзілі па хатах з добрымі пажаданнямі. Гаспадары за гэта частавалі гасцей.

SLOVO.WS

### Калядкі

У нашага дзядзькі двор гараджоны,
Дай, Божа, яму шчасця, здароўя.
А ў тым двары ды тры карысці,
Ды тры карысці, ды тры радасці.
Адна радасць — ясна сонейка,
Другая радасць — часты зорачкі,
Трэцяя радасць — ясен месячык.
Ясна сонейка — то жонка яго.
Часты зорачкі — дробны дзетачкі.
Ясен месячык — то сам гаспадар.



К а р ы́ с ц ь — добры вынік, выгада.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## Прыказкі

Прыйшлі Калядкі — бліны ды аладкі.
Насталі Калядкі — гаспадарам парадкі.

Зіму праводзяць святам — Масленіцай. Дарослыя пякуць бліны, весяляцца, ладзяць кірмашы. А дзеці абыходзяць двары, збіраюць бліны, катаюцца на санках. На Масленіцу спяваюць вясёлыя песні.

SLOVO.WS

## Наша Масленіца гадавая



А мы Масленіцу чакалі
І ў ваконца паглядалі.
Гару сырам набівалі,
Зверху маслам палівалі.

А ад сыру — гара сыра,
А ад масла — гара ясна.

А на дварэ сняжкі сыплюць,
А нас мамкі дамоў клічуць.

все учебники на www.slovo.ws



все учебники на www.slovo.ws

1. Калі святкуюць Масленіцу?

2. Якую пару года праводзяць гэтым святам?

3. Чым займаюцца ў час свята дарослыя і дзеці?

4. Які настрой перадаецца ў гэтай песні? Перадайце яго пры чытанні.

## ВЯСНОВЫЯ ПЕСНІ

slovo.ws

У сакавіку клічуць вясну: пякуць з цеста птушак, падкідваюць іх уверх і спяваюць вясновыя песні. Гэтае свята называецца Гуканне вясны.

### Жавароначкі, прыляціце

Жавароначкі, прыляціце,
Вясну красную прынясіце,
Каб сонейка засвяціла,
Каб снег белы растапіла,
Каб садзікі расквяціла.



все учебники на www.slovo.ws



все учебники на www.slovo.ws

Жаваронačкі, прыляціце,
Зямлю-матухну абудзіце
І дождыкам напаіце,
Каб травачкі нарасціла,
Каб волікаў накарміла.



1. Чаму людзі звяртаюцца да жаваронačкаў?
2. Аб чым яны просяць іх? Прачытайце.
3. Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем.
4. Як вы разумееце выразы: «вясна красная», «зямля-матухна»?
5. Якая мелодыя можа быць у гэтай песні?



все учебники на www.slovo.ws

## КУПАЛЬСКІЯ ПЕСНІ

Свята Купалле адзначаецца ў самую кароткую ноч лета. Дзяўчаты і хлопцы скачуць цераз вогнішча, спяваюць купальскія песні, шукаюць кветку шчасця — папараць. Існуе народнае павер'е, што той, хто яе знойдзе, заўсёды будзе шчаслівы.

### А на Купалу...



А на Купалу
Рана сонца іграла —
Рана сонца іграла
На добрыя гады,
На цёплыя росы,
На цёплыя росы,
На хлябы-ўраджаі,
На хлябы-ўраджаі.

1. Прачытайце песні «А на Купалу...» і «Купалінка» (змешчана на форзацы). Якая з іх вам больш спадабалася? Чаму?
2. Вызначце, як трэба прачытаць песні (хутка, павольна, напеўна).
3. Чым падобныя гэтыя песні?



все учебники на www.slovo.ws

4. Знайдзіце ў песнях словы, якія ўжываюцца з памяншальна-ласкальным значэннем. Што надаюць яны песні?

5. Вывучыце адну з песень на памяць.

## ЛІРЫЧНЫЯ ПЕСНІ

Лірычныя песні непасрэдна не звязаны з абрадамі і календаром. Спяваюць іх за працай і на адпачынку, у радасці і ў горы. Такія песні выказваюць розныя пачуцці, перажыванні. Лірычныя песні могуць быць вясёлыя, жартоўныя, а часам і сумныя.

slovo.ws

### Рэчанька



— Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўная?
Люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

Чаму ж ты не поўная,
З беражком не роўная?
Люлі, люлі, люлі,
З беражком не роўная?



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

— А як жа мне поўнай быць,
З беражкамі роўнай плыць?
Люлі, люлі, люлі,
З беражкамі роўнай плыць?

Ясю коніка паіў,
Кася ваду чэрпала.
Люлі, люлі, люлі,
Кася ваду чэрпала.



1. Вызначце, да каго звяртаюцца ў песні.
2. Прачытайце, пра што пытаюцца ў рэчаньکі.
3. Што адказвае яна? Знайдзіце адказ у тэксце.
4. Якой вы ўяўляеце рэчаньку? Апішыце яе словамі.
5. Як вы прачытаеце тэкст (павольна, напеўна, хутка)?


все учебники на www.slovo.ws

## Певунок

— Кукарэку, певунок,
Пашый сабе кажушок,
Пашый штонікі з шаўкоў,
З залацістых паяскоў.

І пашыў, і надзеў,
І ў люстэрка паглядзеў,
І пашыў ён, і надзеў,
І ў люстэрка паглядзеў!
Усё!





все учебники на www.slovo.ws

Ж а р т о́ ў н а я — забаўная, смешная.

1. Прачытайце тэкст песні.

2. Чаму гэтую песню называюць жартоўнай?

3. Як вы думаеце, ці падобна яна на маленькую казачку? Чым?

4. Якія іншыя жартоўныя песні вы ведаеце?

### Паразважайце над пытаннямі

1. З якімі песнямі вы пазнаёміліся? Назавіце іх.

2. Пра што гаворыцца ў восеньскіх песнях?

3. З якімі святамі звязаны зімовыя песні? Дзе, калі і як яны спяваюцца? Чым яны адрозніваюцца ад восеньскіх песень?

4. У чым розніца паміж вясновымі і летнімі (купальскімі, жніўнымі) песнямі?

5. Як ладзяць свята Купалле? Якія песні спяваюць у час свята?

6. Назавіце песні, якія вам больш за ўсё запомніліся, спадабаліся. Абгрунтуйце свой выбар.



SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## БАЙКІ

### Чаму кот пасля яды мыецца

Злавіў кот мыш. А мыш ды і давай у яго прасіцца, каб ён пусціў яе на волю. А кот не пускае. Тады мыш давай хітраваць. Яна і кажа кату: «Коцік, усе людзі перад ядой мыюцца. А ты сёння яшчэ не мыўся. Памыйся, а тады сабе і з'ясі мяне».

Кот давай лапамі мыцца, а мыш хутка пад палок — і даганяй яе.

Пасля таго выпадку ўсе каты мыюцца пасля яды.

? Як мыш перахітрыла ката? Перакажыце байку.





SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## Хто задзірае нос угору

Спытаў хлопчык бацьку: «Скажы мне, тата, чаму гэта адзін колас так і гнецца да зямлі, а другі — тарчма тарчыць?»

— Які колас поўны,— адказаў бацька,— той да зямлі гнецца, а які пусты, той і тарчыць угору.



1. Як вы разумееце назву твора?
2. Ці будзе выхаваны чалавек «задзіраць нос»?
3. Чым цікавыя байкі? Якая з іх вам спадабалася больш?



все учебники на www.slovo.ws

## ЛЕГЕНДЫ

### Адкуль узнік горад Мінск

Горад гэты заснаваны нейкім асілкам і чарадзеем Менескам. Менеск нібыта пабудаваў на рацэ Свіслачы млын на сямі колах. У яго млыне мука малолася не з жыта, а з камення. У поўнач ён раз'язджаў на сваім млыне па дарозе і збіраў дружыну з дужых людзей. З іх потым утварыўся цэлы народ, які пачаў сяліцца побач з млыном чараўніка.

Мясцовасць, дзе жыў гэты чарадзей, пачалі называць Менескам. А потым у гаворцы назва стала Менск, а затым і Мінск.

К о́ л а — круг са спіцамі, які круціцца па восі.

М л ы н — машына для размолвання зярнят.

Ч а р а д з е́ й — чараўнік, вядзьмар.





все учебники на www.slovo.ws

## Як узнікла назва Гомель

Там, дзе цяпер стаіць Гомель, некалі было шмат пяску пасярэдзіне ракі Сож. Каб плыты і баркі, што плылі па рацэ, не занесла на мель, на беразе каля гэтага месца заўсёды стаяў чалавек і крыкам папярэджваў:

— Го! Мель! Го! Мель!

Вось і пайшло Гомель.



SLOVO.WS

📖 Ба́рка — невялікае рачное судна.

1. Прачытайце легенды. Пра што вы даведаліся з іх?
2. Перакажыце легенду, якая вам найбольш спадабалася.
3. Ці ведаеце вы легенду аб паходжанні назвы свайго горада, вёскі?



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ

Казка — вуснае апавяданне. У ёй людзі з даўніх часоў выказвалі свае мары аб шчасці, аб перамозе дабра над злом, аб цудоўных і чароўных краінах, дзе хацелася б жыць. Яна складалася людзьмі, расказвалася, перадавалася імі з вуснаў у вусны, ад аднаго пакалення да другога — так узнікла народная казка.

У большасці такіх твораў ёсць казачны пачатак: «Жылі-былі...», «У некаторым царстве...» «Даўно гэта было...» і казачны канец: «... і я там быў, мёд-піва піў, па вуснах цякло, а ў рот не папала», «Вось вам казка, а мне абаранкаў вязка».

Героямі казак могуць быць звычайныя людзі і жывёлы, розныя чарадзеі і чарадзейныя прадметы, з'явы прыроды.





все учебники на www.slovo.ws

## Каток — залаты лабок

Жыў дзед з бабаю. Былі яны вельмі бедныя: ні насіць няма чаго, ні варыць.

Баба кажа:

— Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, ссячы дубок, завязі на рынак, прадай і купі мукі. Спячом хлеб.

Сабраўся дзед, паехаў у лясок, пачаў секчы дубок. Выскачыў з дуба каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Дык вось, каточак, мой галубочак, пасла мяне баба ссекчы дубок, завезці на рынак, прадаць і купіць мукі на хлеб.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе ў вас мука!

Прыехаў дзед, а ў яго мукі повен засек!

Спякла баба хлеб, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і заціркі наварыць. Ды солі няма. Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок, папрасі ў яго солі.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, зала-



все учебники на www.slovo.ws



тое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць — солі няма.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе соль!

Прыехаў дзед, а ў яго солі дзежка стаіць.

Наварыла баба заціркі, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і капусткі паспытаць. Вастры, дзед, тапарок, едзь у лясок, стукні ў



все учебники на www.slovo.ws

дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок, папрасі ў яго капусты.

Навастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць, соль ёсць, капусты няма.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе капуста!

Прыехаў дзед дахаты, а ў яго капусты поўная кадушка!

Баба кажа:

— Ай, як добра! Вось каб цяпер яшчэ і сальца... Мы б з табою капусты наварылі, сальцам закрасілі б. Не палянуйся, дзеду: вазьмі тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок, папрасі ў яго сальца.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: просіць баба яшчэ сальца да капусты.

— Добра, дзед, едзь дахаты: будзе сала!



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Прыязджае дзед, а ў яго сала кубелец!

Рады дзед і баба. Сталі яны жыць-пажываць, дзецям казкі казаць. І цяпер жывуць, хлеб жуюць, капустаю з салам закусваюць.

Вось вам казка, а мне абаранкаў вязка.

Дзе́жка — драўляны посуд для заквашвання цеста.

Заці́рка — ежа, згатаваная з малака і мукі.

Кубе́лец — кадушка, бочка.

1. Чым прывабіла вас казка?

2. Прачытайце, як апісаны каток — залаты лабок у казцы.

3. Якая розніца ў словазлучэннях: *залаты лабок* — залаты лоб, *залатое вушка* — залатое вуха, *залатая лапка* — залатая лапа і г. д.?

4. Дзе вы сустракалі ўжо словы з памяншальна-ласкальным значэннем?

5. Як пачынаецца і заканчваецца казка?

6. Якія яшчэ пачатак і канец могуць быць у казках?

7. Чым блізкія «Казка пра рыбака і рыбку» А. С. Пушкіна і беларуская народная казка «Каток — залаты лабок»?



все учебники на www.slovo.ws

8. Чаму пушкінская казка закончылася для герояў сумна, а гэтая — весела і радасна?
9. Ці адрозніваюцца героі гэтых дзвюх казак? Чым?

## Скорагаворкі

Каток нітак клубок закаціў у куток.

Спрытна ўкроп палоў Пракоп.
Лёг пад плотам і захроп.

## Лісіца і Гусак

Неяк Лісіца злавіла Гусака і кажа: «Гусак, Гусак, я цябе з'ем!»

Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго. Вось ён і гаворыць: «Хай будзе так, Лісічка. Толькі дазволь мне перад смерцю патанцаваць».

Ліса адказвае: «Танцуй сабе, а з'есці я цябе яшчэ паспею».

Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пераступаць.

Глядзіць Лісіца на Гусака і смяецца: «Вось дык Гусак! Вось дык танцор!»



все учебники на www.slovo.ws

А Гусак крыламі махаў, махаў, з нагі на нагу пераступаў, а потым падняўся ў паветра і паляцеў.

Так і засталася Лісіца з разяўленым ротам.



? 1. Хто ў казцы вам спадабаўся, а хто не? Чаму?

2. Пра лісіцу кажуць, што яна надта хітрая. А якая яна ў гэтай казцы?

3. Як змог Гусак захаваць сваё жыццё?

4. Уявіце, што вы — Лісіца. Раскажыце казку ад імя Лісіцы.

5. Успомніце казкі, у якіх ліса хітрая.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## Бацькоўскія парады

Жыў у адным сяле чалавек, у якога быў сын. Вось аднойчы бацька і кажа:

— Слухай, сынку! Жыві так, каб ты меў у кожным сяле хату, на кожны дзень новыя боты і каб табе ўсе людзі кланяліся.

Задумаўся сын над бацькоўскімі словамі, а потым пытае:

— Як жа я магу паставіць у кожным сяле хату, купляць штодзень новыя боты і прымусіць усіх, каб мне кланяліся?

Засмяяўся стары і кажа:

— Вельмі лёгка, сынку! Будзеш мець у кожным сяле надзейнага сябра — будзеш мець і сваю хату.

— Каб на кожны дзень былі новыя боты, трэба іх штовечар чысціць, і раніцай яны будуць як новыя.

— І ўставай, сынку, на золку — раней за ўсіх, ідзі і працуй. А як пачнуць ісці на работу людзі, то ўсе будуць з табой вітацца і кланяцца.

📖 Н а з ó л к у — на світанку, раніцай.

П р ы м у ш á ц ь — патрабаваць, каб нешта было зроблена.



все учебники на www.slovo.ws

SLOVO.WS

все учебники на www.slovo.ws

❓ 1. Перачытайце парады, якія даваў бацька сыну.
2. Растлумачце першую параду бацькі.
3. Якімі з гэтых мудрых парад вы ўжо карыстаецеся?

## Прыказкі

Не адкладвай на заўтра тое, што паспееш зрабіць сёння.

Рана ўстанеш — многа зробіш.

Сёння зробіш — заўтра як знойдзеш.

Не той сябар, хто мёдам мажа, а той, хто праўду кажа.

Шануй людзей, тады і цябе будуць шанаваць.

У добрага чалавека заўсёды многа добрых людзей.

Хто працуе, той святкуе.

Якая справа, такая і слава.



все учебники на www.slovo.ws

## Самае добрае

Жыў-быў вельмі мудры чалавек. Была ў яго дачка — малая дзяўчынка. Жылі яны ў прыгожым вялікім доме. А каля дома быў сад, поўны кветак. З раніцы да вечара малая дзяўчынка гуляла ў садзе альбо бегала па пакоях дома. Толькі ў адзіны пакой яна не ўваходзіла, таму што ён заўсёды быў замкнуты.

Аднойчы дзяўчынка пачала ўпрошваць мудраца:

— Дазволь мне, тата, зірнуць на замкнуты пакой! Ён, напэўна, самы добры.

— Там, сапраўды, за дзвярыма ляжыць самае добрае,— адказаў бацька.— Але ты яшчэ зусім маленькая. Вось калі вырасцеш, я дам табе тое, што там захоўваецца. І падарунак гэты будзе радаваць цябе ўсё жыццё.

Расла дзяўчынка і вырасла. Даў ёй мудры чалавек залаты ключ ад таго замкнутага пакоя. Пабегла яна, адчыніла дзверы, і што ж яна ўбачыла? Прасніцу, верацяно і разгорнутую кнігу.

Больш нічога ў пакоі не было.

Пайшла дзяўчына да бацькі і сказала яму праз слёзы:



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

— Ты, бацька, мне казаў, што ў гэтым пакоі знаходзіцца самае лепшае, а я там знайшла толькі прасніцу, верацяно і кнігу.

— Але ж гэта, дачка мая, і ёсць самае лепшае,— адказаў ёй мудры чалавек.— Прасніца і верацяно — гэта праца, а кніга — вучэнне. Лепш за іх няма нічога на свеце. Усё добрае на свеце дасягаецца толькі працай і ведамі.

**Верацяно́** — драўляная палачка з завостранымі канцамі для ручнога прадзення.

**Пра́сніца** — прыстасаванне для прадзення.

1. Чым здзівіла вас казка?
2. Чаму мудрэц не дазволіў зайсці ў пакой маленькай дзяўчынцы? Як пра гэта гаворыцца ў казцы? Прачытайце.
3. Што ўбачыла дзяўчына ў таямнічым пакоі?
4. Знайдзіце ў казцы прыказку.
5. У чым бачыў сэнс жыцця мудры чалавек?
6. Перакажыце казку блізка да тэксту.



все учебники на www.slovo.ws

## ЛІТАРАТУРНАЯ КАЗКА

Яна падобна да народнай. Але ў адрозненне ад народнай літаратурная казка мае свайго аўтара-пісьменніка. Аўтар, складаючы казку, можа выкарыстаць народны сюжэт (змест) або прыдумаць свой.

## Дружбакі

*Расціслаў Бензярук*

На лясной паляне жылі па суседству Заяц і Вожык. Звяркі адзін без аднаго і дня не маглі пражыць. Аднойчы Заяц сказаў Вожыку:

— Мы з табою такія дружбакі, што вадою нас не разліць!

— Нават вялікі дождж нас не разлучыць,— у тон яму адказаў Вожык.

Пачула гэта Хмара і не на жарт разззлавалася:

— А мы яшчэ паглядзім!

І склікала сваіх дзяцей.

— Дапамажыце, дзетачкі, напалохаць вунь тых смельчакоў, што старой хмары ўжо не баяцца,— паказала на Зайца і Вожыка.

— Я згодная! — першай падхапілася Маланка і паласнула агнявым бізуном.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

— Тр-рэба — мы г-г-гатовыя! — заракатаў Гром.

А Дождж нічога не сказаў, толькі з усіх сіл пачаў паліваць лес.

— Пабеглі да мяне, перачакаем дождж,— прапанаваў Вожык.

— Не, у мяне хата большая!

— У мяне самавар паставім, чай заварым...

Так і не дагаварыўшыся, звяркі разбегліся. Кожны ў сваю хату.

Раз-пораз бліскала Маланка, грымеў Гром. Сумна і страшна Зайцу аднаму ў хаце.

— Дарэмна я не паслухаўся Вожыка,— пашкадаваў Заяц.— Як радасна было б разам! Можа, ён таксама адзін дома. І яму таксама сумна. Пабягу да Вожыка!

«Але ж на дварэ дождж,— з бояззю падумаў Заяц.— Нічога, да Вожыкавай хаткі зусім блізка».

— Чаму я пакрыўдзіў Зайца? — шкадаваў Вожык.— Зараз нам удваіх было б лепш!

Выбеглі звяркі са сваіх хатак, сустрэліся на паўдарозе.

— Табе сумна было, Вожык?

— Сумна. А табе?

— Вельмі.



все учебники на www.slovo.ws

— А цяпер?

— Цяпер весела...

Стаяць, размаўляюць, не зважаюць на дождж. Смяюцца, радасныя, быццам даўно-даўно не бачыліся.

Зразумела Хмара: не разлучыць ёй дружбакоў, прашаптала:

— Нічога, знайду такіх, што мяне збаяцца і ад дружбы адмовяцца!

І паплыла далей.

А хіба знойдуцца такія?

📖 Бізу́н — плеценая пу́га.

❓ 1. Чым спадабалася вам казка?

2. Прачытайце, хто і як вырашыў пасварыць сяброў.

3. Як адчувалі сябе звяркі ў час дажджу ў сваіх хатах?

4. Пра каго кажуць: «Іх вадой не разліць»?

5. Адкажыце на пытанне апошняга сказа.

6. Чаму апавяданне называецца «Дружбакі»?

7. Размяркуйце ролі і прачытайце казку па ролях.

все учебники на www.slovo.ws



все учебники на www.slovo.ws

## Дружная сям'я



Складзіце па малюнках апавяданне.



SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## Усмешка

*Галіна Васілеўская*

У даўнія-даўнія часы на беразе сіняга мора стаяў блакітны казачны горад. Жылі ў ім шчаслівыя людзі. Удзень яны працавалі і спявалі песні, бо праца прыносіла ім радасць. А ўвечары з іхніх дамоў лілася музыка.

Сустракаючыся, людзі ўсміхаліся адзін аднаму — такое было ў іх прывітанні.

Пра тое, што на свеце ёсць горад, у якім усе людзі шчаслівыя, даведаўся злы чараўнік. Той самы, які ніколі не спяваў, не любіў музыкі і не ўсміхаўся. Ён рабіў толькі чорныя справы: хлусіў, прыдумваў плёткі, лаяўся.

— Я не ведаю, чаму тыя людзі шчаслівыя,— сказаў сам сабе чараўнік.— Яны шчаслівыя таму, што ўмеюць усміхацца. Вось палячу я ў той горад, адбяру іхнія ўсмешкі і стану адзін шчаслівы.

Сеў ён на свой дыван-самалёт і паляцеў. Ляцеў ноччу, бо ўсе злыя чараўнікі лётаюць толькі ноччу, калі добрыя людзі спяць і бачаць харошыя сны.

Унізе паказаліся блакітныя дахі, і злы чараўнік здагадаўся, што гэта і ёсць той самы казачны горад.


все учебники на www.slovo.ws



Пачало світаць. З-за мора выкаціўся залаты шар сонца. Цёплыя хвалі лашчылі бераг, усыпаны гладкімі каменьчыкамі. З комінаў цягнуўся лёгкі дымок.

Седзячы за комінам, злы чараўнік чакаў, пакуль хто-небудзь з'явіцца на вуліцы.

Нарэшце ён убачыў першага жыхара казачнага горада. Той ішоў і ўсміхаўся сонцу, якое шчодра грэла зямлю, птушкам, якія весела спявалі на дрэве, і зялёным лісточкам, што трымцелі ад лёгкага ветрыку.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Чараўнік вылецеў з-за коміна і апынуўся перад чалавекам.

— Аддай усмешку! — крыкнуў ён страшным голасам, ад якога пасыпалася лісце з дрэў і перасталі спяваць птушкі.

Усмешка адразу знікла з твару чалавека — як яе возьмеш?

Тады чараўнік падбег да другога чалавека і гукнуў:

— Аддай усмешку!

Але зноў адабраць не змог. Яна таксама знікла.

Чараўнік паспрабаваў украсці ўсмешку, забраць яе непрыкметна, каб ніхто не бачыў. І з гэтага нічога не выйшла...

— Куплю ўсмешку,— вырашыў нарэшце чараўнік.

Але ўсе, каму ён гаварыў пра гэта, толькі паціскалі плячамі.

Чараўнік заплакаў ад крыўды. Злыя слёзы градам пакаціліся па яго зморшчаных шчоках.

Адзін добры чалавек пашкадаваў чараўніка, пасадзіў яго на лаўку ля блакітнага фантана, выцер ягоны твар ад слёз і спытаў:

— Чаго ты плачаш, добры чалавек?



все учебники на www.slovo.ws

Ніхто ніколі не звяртаўся да чараўніка з такімі словамі, і ён заплакаў яшчэ гарчэй.

— Не магу больш так жыць,— усхліпваючы, прагаварыў чараўнік,— ніхто мяне не любіць, няма ў мяне сяброў... Я хачу ўсміхацца, як усе, але не магу здабыць сабе ўсмешку.

— Усмешку не купіш і не ўкрадзеш,— сказаў жыхар казачнага горада.— Яе дораць за добрыя справы. Успомні, ці зрабіў ты сёння што добрае. У полі працаваў?

— Не,— адказаў чараўнік.

— Дом будаваў?

— Не.

— Хлеб пёк? Адзежу шыў? Можа, дзяцей добраму вучыў?

— Не, не, не,— і чараўнік нізка апусціў галаву.

Чалавек уздыхнуў:

— Дрэнныя твае справы. Але ты можаш памагчы сабе сам. Рабі дабро.

І жыхар казачнага горада пайшоў на працу.

А чараўнік сядзеў і ўсхліпваў, бо не ведаў, як яно робіцца, тое дабро.

Маленькая дзяўчынка бегла ў садзік, спатыкнулася аб каменьчык і ўпала.

Чараўнік падхапіўся, падняў дзяўчынку і стаў дзьмуць на яе пабітае каленца, каб не балела.



все учебники на www.slovo.ws

Дзяўчынка, якая толькі што хацела заплакаць, раптам усміхнулася чараўніку так прыветна, што і яго губы таксама расцягнуліся ва ўсмешцы. Першы раз у жыцці!

Яму стала так лёгка, так весела, што ён пацалаваў дзяўчынку ў абедзве шчакі, сеў на свой дыван-самалёт і паляцеў рабіць добрыя справы. Цяпер ён, напэўна, стаў шчаслівым, добрым чараўнікам і сам дорыць людзям усмешкі.

Трымце́ць — дрыжаць.

1. Як жылі шчаслівыя людзі?
2. Чаму злы чараўнік спачатку не мог здабыць усмешку?
3. Якім быў казачны горад? За што дарылі ў ім усмешкі?
4. Што дапамагло злому чараўніку стаць добрым? Знайдзіце адказ у тэксце.
5. Складзіце план казкі. Перакажыце казку па плане.
6. Якая прыказка ці прымаўка падыходзіць да казкі?
7. Ці ёсць адрозненне паміж народнай казкай і літаратурнай? Растлумачце.



все учебники на www.slovo.ws

# «Мой родны кут! Як ты мне мілы...»



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

## Беларусь — мая Радзіма

*Артур Вольскі*



Якая прыгожая назва ў нашай краіны — Беларусь!

А яшчэ мы завём яе — Радзіма. А яшчэ — Бацькаўшчына.

Радзіма — бо тут мы нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін на цэлым свеце.

Бацькаўшчына — бо яна дасталася нам ад бацькоў нашых. А ім ад іхніх бацькоў — нашых дзядоў. А далей — ад прадзедаў, ад прапрадзедаў... І так — аж да самых далёкіх продкаў.

Над шырокімі палямі, над векавечнымі пушчамі, над зялёнымі лугамі, над блакітнымі стужкамі рэк і рачулак, над люстэркамі незлічоных азёр лунаюць у высокім небе белакрылыя буслы. Таму паэт назваў краіну нашу зямлёю пад белымі крыламі.

А колькі багаццяў схавана ў зямлі гэтай! Калійныя солі, якімі ўзбагачаюць глебу, каб яна не бяднела і давала добрыя ўраджаі. Іх здабываюць беларускія шахцёры пад Салігорскам. Вучоныя-геолагі знайшлі ў нетрах Беларусі і золата і



все учебники на www.slovo.ws

кажуць, што ёсць нават алмазы. Трэба толькі як след пашукаць...

Жыта ў полі, яблыкі ў садах, свойская жывёла на падворках, звяры ў лясах, рыба ў водах... Ды хіба пералічыш усё!

Але самы вялікі скарб Беларусі — гэта людзі, беларусы.

Побач з беларусамі жывуць у нашых гарадах і вёсках палякі, літоўцы, рускія, яўрэі, татары...— выхадцы з іншых краін. Усе разам мы складаем беларускі народ. Усе мы — грамадзяне незалежнай Рэспублікі Беларусь. Так завецца наша дзяржава. Усе мы павінны памнажаць сваёй працай яе багацці, бараніць ад нягод і напасцяў, як баранілі яе нашы продкі.

Л у н а́ ц ь — плаўна лятаць, рухацца ў паветры.

Н е́ т р ы — глыбіні зямлі.

1. Як пісьменнік ставіцца да сваёй Радзімы? Адкуль гэта відаць?

2. Як называюць нашу краіну? Чаму? Прачытайце.

3. Чым багата наша краіна?

4. Хто жыве побач з беларусамі? Раскажыце.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

5. Што павінен рабіць кожны чалавек, каб яго краіна была багатай і моцнай?
6. Успомніце прыказкі пра Радзіму.

## Чароўны край

*Зоська Верас*

Сыночку маленькі, ты руку мне дай,
Цябе павяду я ў нязведаны край,
Мы пойдзем вузенькай мяжою ўдваіх,
Так мякка, што крокаў не ўчуем сваіх,
Так мякка, прыгожа, пахуча... аж рай!
Сыночку маленькі, ты руку мне дай...
Глянь, жыта красуе на ўзгорку крутым,
Русалкі-дзяўчаткі хаваюцца ў ім.
А зайчык, прысеўшы ля самай мяжы,
На жабку міргае: «Дзе я, не кажы».
На лузе зялёным сам бусел стаіць,
А кнігаўка ўецца і просіць: піць-піць!
Шнур гусак на сонцы бліснуў, закрычаў,
Спусціўся і ў лозах-чаротах прапаў.

Па чыстай, празрыстай азёрнай вадзе
Лілея свае карагоды вядзе...


все учебники на www.slovo.ws

Камарыкі роем лявоніху скачуць...
Ля берага вербы хістаюцца, плачуць...
Чаго яны плачуць? Ты сэрцам згадай...
Сыночку маленькі, ты руку мне дай...

З г а д а́ й — успомні.

М я ж а́ — *тут*: вузкая палоска неўзаранай зямлі паміж участкамі.

1. Пра які нязведаны край распавядае паэтэса?
2. Прачытайце верш самі сабе.
3. У якое падарожжа запрашае маці сына? Прачытайце.
4. Што хоча паказаць маці сыну? Прачытайце.
5. Як вы разумееце выразы: «Лілея свае карагоды вядзе», «Камарыкі роем лявоніху скачуць...»? Чаму «вербы хістаюцца і плачуць...»?
6. Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Чаму аўтар так часта іх ужывае?
7. Якім пачуццём насычаны верш (радасным, сумным, замілаваным)?
8. Падумайце, як трэба прачытаць верш (павольна, хутка)?



все учебники на www.slovo.ws

9. Якія карціны можна намаляваць да верша?

10. Размяркуйце, хто які малюнак зробіць. Кожны малюнак падпішыце словамі з верша.

## Твой род, твая Радзіма

*Васіль Вітка*



Маці, бацька, браты, сёстры. Яны твае самыя родныя, блізкія.

Добра, калі ў цябе ёсць бабуля, дзядуля — гэта з самага малку твае дарагія сямейнікі. Калі ж іх ужо няма, ці ведаеш ты, хто яны былі, як зваліся, ці ёсць у вас дома іх партрэты, іх фатаграфіі?

Ну, а хто былі бацькі тваіх дзядулі і бабулі — твае прадзеды? Як зваліся? Ці захоўваюцца ў вас рэчы, зробленыя іх рукамі, фатаграфіі, пісьмы?

Ці задумваўся калі ты, адкуль пайшоў твой род, адкуль пачалася твая дарога ў жыццё? Бо твая памяць — гэта памяць твайго роду, а памяць народа — вялікая кніга, якая называецца гісторыя.



все учебники на www.slovo.ws

Род і народ яднаюцца адным дарагім словам — Радзіма.

? 1. Прачытайце твор. Як вы зразумелі словы «род», «Радзіма»?

2. Раскажыце пра сваіх блізкіх. Хто яны? Чым займаюцца? Чым яны дарагія вам?

## Край мой

*Генадзь Бураўкін*

Не залаты зусім,
не срэбны,
Быў на табе заўсёды ўбор
Звычайны самы, самы зрэбны:
Зялёны луг ды сіні бор,

Каля дарогі жыта ў полі,
Вярба старая ля ракі
Ды ў жоўтым восеньскім прыполе
Рабін даспелых аганькі.
Ты не сляпіў вачэй.
Быў просты
Ва ўсе вякі твой родны ўзор:
Гаеў бялюткія бярозы,
Густы блакіт лясных азёр,





все учебники на www.slovo.ws

І лён, зусім, як неба,
сіні,
І ўсе ў рамонках берагі...
Мой беларускі, мой адзіны
Край, ад калыскі дарагі.



З р э́ б н ы — ільняны, просты.
Р а м о́ н к і — кветкі.

1. Якія пачуцці перадае ў вершы паэт Генадзь Бураўкін? Пацвердзіце словамі з тэксту.

2. Якія карціны беларускай прыроды вабяць паэта? Прачытайце.

3. На якую адметную рысу нашага краю паэт звяртае ўвагу ў вершы «Край мой»? Назавіце словы, якія дапамагаюць паэту зрабіць гэта.

4. Вывучыце верш на памяць.

**П р ы к а з к і**

Няма смачнейшай вадзіцы,
як з роднай крыніцы.

На чужой старане і вясна не красна.



все учебники на www.slovo.ws

# Мая Беларусь

Паводле
*Уладзіміра Караткевіча*



Настаўіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы. Іх многія і многія тысячы. Гнёзды паўсюль.

І таму мне здаецца, зямлю нашу, Беларусь, можна назваць зямлёю пад белымі крыламі.

Чаму «Беларусь»? Ёсць некалькі варыянтаў паходжання гэтай назвы. Першы: белыя адзенні даўніх вясковых людзей, белыя іхнія валасы, белы колер скуры. Другі. А ён аніяк не супярэчыць з першым. Калі на нашы старажытныя славянскія землі прыйшлі татара-манголы — здолелі адбіцца ад іх амаль адны толькі мы. Мы — адбіліся. І менавіта таму мы «белая», «чыстая ад нашэсця татараў» Русь.

Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону, і пушчы, падобныя на храмы, пушчы, дзе горда нясуць свае кароны алені. Гэта бясконцыя рэкі, у якіх плешчуцца бабры і рыба на заходзе



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

сонца, і гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці.

Гэта ў мінулым гераічная і шматпакутная зямля. Безліч разоў, з пачатку дзён, грукаталі па ёй калясніцы вайны. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі не была агрэсарам. Іншая справа, што яна заўсёды мужна і да канца бараніла сваю праўду і веру.

Ёсць і горкая памяць у маёй зямлі. Дык як інача, калі кожны чацвёрты жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. Першай прыняла яна ўдар ворага і гераічна змагалася з ім... У лясах амаль чатырыста тысяч партызан цаною жыцця адстойвалі ад ворага чысты водар Радзімы. Дзеля таго, каб зберагчы волю, веру, Бацькаўшчыну. Каб спустошаная вайной краіна ажывілася працаю тых, хто выжыў і перамог, заззяла радасцю і святлом, заквітнела садамі і здзіўляла цудоўнымі будынкамі, зашумела нівамі, зазвінела адвечнай і неўміручай нашай песняй.

Пранікніцеся любоўю да роднай Беларусі, дзеці. Велічная і гордая, яна таго вартая.


все учебники на www.slovo.ws

Ве́трась — парус.

Во́дар — прыемны пах, духмянасць.

Збажына́ — жыта, пшаніца, ячмень...

Пу́шча — вялікі лес.

Супярэ́чыць — не згаджацца, выказваць супрацьлеглае меркаванне.

Шматпаку́тны — які перанёс шмат выпрабаванняў.

1. Аб чым расказвае пісьменнік у творы?
2. Якой уяўляе аўтар Радзіму?
3. Якая горкая памяць ёсць у нашай зямлі? Раскажыце, выкарыстоўваючы словы з тэксту.
4. Як пісьменнік тлумачыць паходжанне назвы нашай краіны? Знайдзіце адказ у тэксце.
5. З чаго відаць, што пісьменнік з любоўю ставіцца да сваёй Радзімы?
6. Да чаго заклікае вас пісьменнік? Чаму?
7. Што новага вы даведаліся пра краіну?

### Загадка

У чырвоных ботах па балоце ходзіць, жабак спрытна ловіць.



все учебники на www.slovo.ws

## Родная мова

*Артур Вольскі*

Здарылася так, што людзі аднаго краю палічылі, быццам мова, якою гаварылі бацькі, дзяды і прадзеды, непрыгожая. Нават грубая і нягеглая.

— І чаму,— абураліся адны,— у нас «р» толькі цвёрдае, а ў суседзяў ёсць і мяккае?

— Так, так,— згаджаліся другія,— у суседзяў «г» гучнае, а ў нас амаль як «х»...

— А чаго варта наша дзеканне і цеканне! — дадавалі трэція.— Ці «ў» кароткае...

— Што ж рабіць?

Думалі, думалі і надумалі ўрэшце пазычыць мову ў суседзяў. Яна, маўляў, і багацейшая, і прыгажэйшая. Хоць і вельмі блізкая да тутэйшай. І пазычылі, і ніякіх быццам складанасцей. Многія словы аднолькава ў абедзвюх мовах гучалі. Такія важныя і патрэбныя, напрыклад, як «хлеб» і «соль», «радасць» і «мір», «дом», «поле», «лес»...

Але былі і несупадзенні, праз якія здараліся розныя недарэчнасці. Часам смешныя, а часам і не надта смешныя.

Так, хацеў аднойчы добры чалавек нейкую паслугу зрабіць свайму даўняму сябру. Ды памы-



все учебники на www.slovo.ws



ліўся. Замест паслугі непрыемнасць атрымалася. Сябар дужа пакрыўдзіўся.

А чалавек той лічыўся вельмі адукаваным. Сваёй мовай зусім гаварыць развучыўся. І пачаў апраўдвацца на мове суседзяў.

— У меня,— кажа,— были самые благие намерения...

Хаця словы ў гэтым сказе на абедзвюх мовах гучалі амаль аднолькава, адно з іх мяняла ўвесь сэнс сказанага. «Благие» ў мове суседзяў значыла — добрыя, а «благія» ў мове тутэйшай — дрэнныя, кепскія, паганыя. Усё наадварот!

І столькі падобных выпадкаў было, што і не злічыць.

А тут яшчэ і другая бяда. Пачалі блытаць тутэйшыя людзі, дзе якое «р» вымаўляецца. Дзе трэба мяккае, цвёрдае праскочыць. Дзе трэба



все учебники на www.slovo.ws

цвёрдае, мяккае вылузнецца. Як скажа хто «брукі» замест «брюки», «трапка» замест «тряпка», так суседзі і заходзіліся ад смеху.

Ды і дзекання і цекання пазбавіцца не ўдалося. Толькі ў суседскай мове неўласцівае ёй вымаўленне гучала сапраўды дзіўнавата. А можа, і дзікавата. Не тое, што ў сваёй.

І зноў задумаліся людзі. Што рабіць?

Пайшлі да самага старога і разумнага ў той краіне чалавека. Спыталіся. А самы разумны чалавек і кажа:

— Кожны народ сваю мову мае. Кожнаму народу яна — родная. І не шанаваць, не любіць яе — тое самае, што выракацца маці ды бацькі, той зямлі, дзе мы нарадзіліся, якую родным краем завём. Адно магу вам параіць: шануйце мову родную і суседскую паважайце...

Паслухалі людзі самага старога ды самага разумнага чалавека. І неўзабаве зразумелі, што ні адной на свеце мовай не выкажаш так дакладна свае думкі і пачуцці, як роднай. І яшчэ ўпэўніліся, што дарма ганьбілі яе, і багатая яна, і мілагучная. Не горшая за суседскую і за ўсе іншыя мовы.

Вось і вырашылі тутэйшыя людзі змалку дзяцей абедзвюм мовам вучыць — сваёй і сусед-



все учебники на www.slovo.ws

скай. А хто яшчэ і трэцюю, і чацвёртую ведаць пажадае — калі ласка! Вучы. Старайся. Ад гэтага толькі карысць. І сабе. І людзям. І роднаму краю.

Так вось...
Слова за словам —
і казцы канец,
хто зразумеў яе —
той маладзец!

В ы р а к а́ ц ц а — адмаўляцца.
Г а́ н ь б і ц ь — зневажаць.
Н я г е́ г л а я — няўдалая, непрывабная.
Т у т э́ й ш ы я — людзі, якія жывуць у мясцовасці, пра якую распавядаецца.

?

1. Прачытайце ўважліва твор. Ці правільна робяць людзі, калі адракаюцца ад роднай мовы?
2. Як вы разумееце словы «багатая і мілагучная мова»?
3. Як вырашылі людзі? Адказ знайдзіце ў тэксце.
4. Чаму добра ведаць некалькі моў?



все учебники на www.slovo.ws

* * *

*Юрась Свірка*



У нас хапае слоў такіх
Чысцюткіх, ядраных, як ранне.
Яны выказваюць услых
Пяшчоту, ласку і каханне...

У нас хапае рэдкіх слоў,
І палюбі ты іх бязмежна,
Яны ад чысціні снягоў
І ад пялёсткаў беласнежных.
Яны ўвабралі звон крыніц,
Шум лесу і дыханне ночы...
Ад ліўняў і ад навальніц —
Грымяць, іскрацца і шапочуць.
Журыцца ўмеюць і звінець,
Спяваць у шумным карагодзе.
І трэба сэрцам разумець
І выслухоўваць у народзе.

**Журы́цца** — задумвацца, сумаваць.
**Пяшчо́та** — ласка, замілаванне.
**Я́драны** — *тут*: яркі, выразны.



все учебники на www.slovo.ws

1. З чым параўноўвае Юрась Свірка словы нашай мовы? Прачытайце.

2. Што ўвабралі ў сябе словы роднай мовы? Прачытайце.

3. Вызначце настрой верша, адносіны паэта да родных слоў.

4. Прачытайце верш выразна, перадайце пачуццё любові да роднага слова.

## Шануйце ўсё жывое

*Уладзімір Дубоўка*

Як толькі я сябе помню, бацькі мае і старэйшыя людзі — суседзі — прывучалі нас, малых, шанаваць усё жывое, што вакол нас.

— Не тапчы травіцы, хадзі сцежачкай. Трава вырасце. Яе скосяць — будзе сена кароўкам, каню...

— Не чапай, не ламай гэтага дубочка або сасонкі. З іх вырастуць вялікія дрэвы, яны пойдуць на хату або на шафу...

— Асцярожна рві яблыкі — не паламай, не адвіхні галінку. Дрэва будзе хварэць, на паламаным суку не будзе яблыкаў...

— Праз жыта нацянькі не хадзі. Калі патопчаш яго, будзе менш хлеба...



все учебники на www.slovo.ws



SLOVO.WS

Як толькі я сябе помню, штодня даводзілася пачуць нешта новае і цікавае.

— Гэта зёлка — дзівасіл. Калі выкапаць і высушыць яго карэнне — будзе зелле ад болю ў грудзях.



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

— Гэтая прыгожая красачка — васілёк. Калі яе высушыць — будзе зелле ад хваробы вачэй...

З маленства расло ў мяне замілаванне да прыроды. Нават крапіву я не збіваў кіем. Яна ж расце таксама на карысць чалавеку.

Любіў я, заўважыўшы ў лесе прыгожую кветку-зёлку, выкапаць яе з зямлі і прынесці ў агарод, бо ведаў, што кожная зёлка мае нешта сваё добрае і патрэбнае людзям.

З е́ л л е — лекавыя травы; настой на іх.
З ё л к і — лекавыя травы.
К і й — палка.
Н а ц я н ь к і́ — самым кароткім шляхам.
Ш а н а в а́ ц ь — берагчы, паважаць.

1. Якія парады давалі дарослыя дзецям? Прачытайце.

2. Якія рысы характару выхоўвалі бацькі ў малых?

3. Пра якія лекавыя расліны вы даведаліся з апавядання? Якія яшчэ ведаеце?

4. Як вы разумееце выраз «расло ў мяне замілаванне да прыроды»?

5. Перачытайце твор яшчэ раз моўчкі.



все учебники на www.slovo.ws

## Ясныя дні восені

*Якуб Колас*



Сярод гнілой восені выдаюцца часам ясныя, светлыя дні. Ціха ўсюды. Вецер не скалыхне ні адзін лісцік, ні адну травінку. Ласкавае неба пазірае на зямлю; нідзе ні хмурынкі. Ясна і хораша, усё роўна як вярнулася лета. Падарыла восень людзям яшчэ некалькі ясных, светлых і цёплых дзён.

Хоць усюды і ціха, цёпла і ясна, але ўжо не вее тым жыццём, якое відаць вясною. Куды ні кінь вокам, на ўсім бачыш след восені. Хмурны хваёвы лес чуць заслаўся сінім дымком туману... А бярозы, асіны і дубы чырванеюць здалёк сваім лісцем і напамінаюць сабою аб восені. На ўсім ляжыць сіняваты слой смугі не то дыму, не то туману.

А прыслухаешся — такая цішыня навокал!.. Толькі часам закрычаць у небе дзікія гусі, ключом пранясуцца жураўлі і схаваюцца ў сініх хвалях далёкага яснага неба. Крык іх заціхае памалку і замрэ, расплывецца ў цішыні асенняга дня.



все учебники на www.slovo.ws

Плаўна носіцца ў паветры белая павуціна, сцелецца па зямлі, чапляецца за кусты і сухую траву. Прайшло цёплае лета. Апошнія вы, ясныя дзянькі восені!..



**Смуга́** — дымка; тое, што перашкаджае ясна бачыць.

1. Які настрой выклікае ў вас апісанне апошніх дзянькоў восені?
2. Як выказаны ў тэксце адносіны Якуба Коласа да гэтых дзянькоў?
3. Назавіце прыкметы восені, якія заўважае аўтар.
4. Перакажыце твор, выкарыстоўваючы словы і словазлучэнні з тэксту: апошнія ясныя дзянькі восені, ласкавае неба, след восені, дымок туману, чырванеюць лісцем, жураўлі пранясуцца ключом, крык заціхае, белая павуціна.



все учебники на www.slovo.ws

# Гусанькі

*Станіслаў Шушкевіч*

Паляцелі гусанькі
па цяпло,
Туды, куды лецейка
ўцякло.
Як ляцелі нізенька
над зямлёй,
Жаласліва крыкнулі
ўсёй сям'ёй.
Рэкі і імшарышчы,
сенажаць
Шкода шэрым гусанькам
пакідаць.
Ды надоўга ўдалечы
ім бываць,
Ды надоўга гусанькам
гараваць.
Зноў пачуем зводдалі
шумны крык,
Калі прыйдзе радасны
красавік.
Прынясуць нам з выраю
зноў цяпло,
Што ў пару асеннюю
ўцякло.





все учебники на www.slovo.ws

З в о́ д д а л і — здалёку.

І м ш а́ р ы ш ч ы — лясістыя балоты, пакрытыя мохам.

1. Аб чым гаворыцца ў вершы?

2. Знайдзіце і прачытайце радкі, якія сведчаць, што гусі з жалем пакідаюць ро́дны край. Перадайце пры чытанні гэты настрой.

3. Прачытайце радкі, дзе гаворыцца пра зварот птушак дамоў. Як вы будзеце іх чытаць? Па-ранейшаму сумна ці радасна, весела?

4. Звярніце ўвагу на тое, што верш падобны да народнай песні. На гэта ўказваюць і памяншальна-ласкальныя словы: гусанькі, лецейка, нізенька. Чытаць верш трэба павольна, напеўна.

## П р ы к а з к і

Гусі нізка — зіма блізка.

У чужой старонцы не так свецiць сонца.

Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## Чараўніца

*Зоська Верас*



З далёкай поўначы, з краю вечнага снегу і лёду, парай белых касматых мядзведзяў, спавітая ў белыя пуховыя тканіны, прыехала да нас Чараўніца. Зачаравала воды нашай мілай Зямелькі, і зрабіліся яны камянямі празрыстымі. Зачаравала лясы нашы, і заснулі яны сном глыбокім. Патрэсла шырокімі рукавамі сваёй пуховай вопраткі, і пакрыліся палі нашы снежнай беллю. І лёг наш край пад нагамі Чараўніцы белы, ціхі, задумлівы. Рада яна са свае моцы. Усміхнулася смехам ясным, хоць халодным. Ад гэтага ўсмеху заіскрылася ўсё кругом цэлым морам брыльянтаў шматколерных. І стаіць сярод гэтага мора белі і бляску магутная, грозная, хоць прыгожая, ды бязлітасная. Госця наша штогодняя з далёкай поўначы — Чараўніца Зіма.

**Бязлі́тасная** — жорсткая, суровая.
**Спаві́тая** — закручаная.



все учебники на www.slovo.ws

1. Прачытайце, хто і адкуль да нас прыехаў.
2. Што зрабіла Чараўніца? Раскажыце.
3. Чаму ўсмех у Чараўніцы халодны?
4. Што гэта за Чараўніца?
5. Чаму пра яе напісана: «...магутная, грозная, хоць прыгожая, ды бязлітасная»?
6. Знайдзіце словы, якія характарызуюць зіму. Прачытайце іх.

## Зіма

*Якуб Колас*

SLOVO.WS

Надышлі маразы,
Рэчкі закавалі,
Белыя бярозы
Шэранем убралі.



Замялі дарогі
Ветрыкі снягамі.
Лес, як дзед убогі
З доўгімі вусамі,

Апусціў галіны
І стаіць журботна,



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Зрэдку верхавіны
Зашумяць маркотна.

Мяккая пярына
Вочы адбірае.
Белая раўніна —
Ні канца, ні краю.

Пад плянёнкай белай
Травы і лісточкі.
Рэчка анямела,
Змоўклі ручаёчкі.

Амярцвелі лозы,
Чуць галлём хістаюць,
А ў палях марозы
Ды вятры гуляюць.



**Шэ́рань** — іней.
**Журбо́тна** — сумна, тужліва.

1. Якія карціны зімы ўяўляеце вы пры чытанні верша? Апішыце словамі.

2. Прачытайце, як у вершы апісаны рэчка, бярозы, лес. Што паэт гаворыць пра вятры і маразы? Як вы разумееце сказы:



все учебники на www.slovo.ws

«Мяккая пярына вочы адбірае», «Рэчка анямела»?

3. Параўнайце сказы: «Дрэвы ў лесе пакрыты снегам» і «Лес, як дзед убогі з доўгімі вусамі, апусціў галіны і стаіць журботна». Які з іх дапамагае лепш уявіць карціну зімовага лесу? Чаму?

4. Чытайце верш павольна, захоўвайце паўзы пры знаках прыпынку.

### Загадка

Ляцяць птушкі без крыл, а садзяцца без ног.

SLOVO.WS

## Зімой

*Максім Багдановіч*

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,



все учебники на www.slovo.ws

У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць...



Ма́ра — жаданне, імкненне, мэта.

1. Які настрой адпавядае вершу?
2. Чаму Максім Багдановіч піша:
«У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць...»?
3. Як вы разумееце радок: «І волен лёгкіх санак бег»?
4. Намалюйце карціну да слоў верша:
«Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць».
5. Якія фарбы вы выкарыстаеце? Чаму?
6. Вывучыце верш на памяць.



все учебники на www.slovo.ws

## Што зрабіў мароз?



Разгледзьце малюнкі і адкажыце на пытанне:
*Што зрабіў мароз?*



все учебники на www.slovo.ws

## Прыгожая лісіца

*Алесь Асіпенка*

Узыходзіла сонца... Паляўнічы спыніўся, прыслухоўваючыся да цішыні. Раптам убачыў лісіцу на тым баку ракі. Яна бегла, распушыўшы хвост і нізка прыгнуўшы галаву. Нечакана спынялася, разграбала лапамі снег, кідалася ў бакі, нібы гуляла сваім хвастом. Лісіца мышкавала. Было відаць, што яе ахапіў паляўнічы азарт.

Не чуючы бяды, яна набліжалася да рэчкі. На яркай белі асветленага сонцам снегу асабліва выразна відаць быў руды хвост.

«Чакай жа, галубка, я цябе заманю бліжэй», — падумаў паляўнічы. Ён прыладзіўся паміж дзвюх хваін і пасвістваў, пераймаючы мышыны піск.

Лісіца доўга не звяртала ўвагі на яго папіскванне. Потым стала, наструніўшы цела, і раптам пайшла, нюхаючы паветра. Час ад часу яна спынялася. Можа, ёй здавалася, што гэта пішчаць не мышы, а нехта яшчэ. Але паляўнічы ведаў, што лісіцу захапіў азарт. Цяпер яна не адступіцца, пакуль не знойдзе месца, дзе хаваюцца мышы-палёўкі.

Праз заснежаныя лапкі хваін паляўнічы добра бачыў лісіцу. Асветленая сонцам, яна была



все учебники на www.slovo.ws



прыгожая ў сваім рыжым уборы. Вось яна падышла да берага ракі, навастрыла вушы. Паляўнічы зноў хуценька піскнуў разы два. Ён не зводзіў вачэй з лісіцы. Да яе было метраў пяць, не больш.

Лісіца задрала вострую мордачку. Яна не магла зразумець, чаму палёўка пішчыць уверсе. І раптам рыжая сустрэлася чорнымі вачамі з вачамі чалавека. Паляўнічы бачыў у лісіных вачах толькі цікаўнасць — ні страху, ні збянтэжанасці. Так вочы ў вочы глядзелі некалькі імгненняў чалавек і звер. Паляўнічы трымаў стрэльбу, але забыўся на яе. Лісіца паматала галавой і зноў паглядзела на чалавека. Яго разбіраў смех.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

— Здарова, рыжая,— сказаў паляўнічы.— Як справы? Гуляеш?

Лісіца кінулася ўбок, пабегла, падмятаючы хвастом парошу.

— Уцякай, уцякай, рыжая,— крычаў ёй наўздагон паляўнічы.

Але лісіца не прыбаўляла кроку.

Пашкадаваў яе чалавек. Такая прыгожая, што рука не паднялася.

Збянтэ́жанасць — разгубленасць.
Мышкава́ць — лавіць мышэй.

slovo.ws

1. Прачытайце, як мышкавала лісіца. Як паляўнічы заманьваў яе?
2. Якой вы сабе ўяўляеце гэтага звера? Знайдзіце ў тэксце яе апісанне.
3. Які самы напружаны момант у апавяданні?
4. Ці хваляваліся вы за лясную прыгажуню? Калі?
5. Што сказаў чалавек лісе? Прачытайце.
6. Чаму паляўнічы не выстраліў?



все учебники на www.slovo.ws

## Калінавая рукавічка

*(Скарочана)*

*Алена Васілевіч*



Чаму рукавічка, калі казка будзе пра чырвоную каліну, пра старую яліну-казачніцу, пра ветра-бяздомніка?

А вось паслухай.

Расла на ўзлессі каліна. Была-была ўсё маленькая ды раптам, зусім неяк непрыкметна, вырасла. Зацвіла белым цветам, закрасавала — на дзіва і зайздрасць усім суседнім дрэвам.

— Ф-фарсуха,— пазіраючы на яе, аж трэсліся ў лажку асіны. Яны былі заўсёды бледныя і зялёныя, і заўсёды ім было холадна.

— Падумаеш, выстраілася,— шапталі хмурыя яліны. Яны насілі цёмнае адзенне і размаўлялі шэптам.

Толькі старая яліна-казачніца спачувальна пазірала на каліну-прыгажуню і жаласна ківала галавой:

— Пацвіце, пакрасуецца ды і завяне. Не яна першая, не яна апошняя... Па лесе гуляе бура, ломіцца грубая жывёла, чалавек ходзіць. А ў яго



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

нядобрыя рукі. Ён ломіць і крышыць усё, што ні стрэне на дарозе...

Яліна-казачніца пражыла доўгае жыццё і ўсяго нагледзелася за свой век...

Цэлымі днямі гойдалася яна на старэчых нагах ды моўчкі прыглядалася да лясного жыцця: як трымаюцца і пра што вядуць гутарку маладзейшыя дрэвы, аб чым пяюць птушкі, куды лятае вецер-бяздомнік...

Па суседстве з ялінай у цёплым асінавым гняздзе жыла вавёрка. Яна была свавольніца і балаболка. Але старая яліна паважала вавёрку за працавітасць і спрыт.

Усё лета рыжым полымем гойсала яна з дрэва на дрэва, быццам нельга было прыдумаць іншага занятку. Але варта было толькі азвацца недзе яшчэ зусім далёкай восені, як вавёрка кідала гульні і бралася за работу. Рамантавала сваю хатку. Потым з ранку да вечара насіла смачныя лясныя арэхі. Не прысядала ні на хвіліну...

Старая яліна толькі дзівілася: адкуль у вавёркі столькі сілы, каб цэлымі днямі цягаць гэтыя ношкі? І сама не вытрымлівала. Набярэ поўны прыпол духмяных зярністых шышак і высыпле вавёрцы.


все учебники на www.slovo.ws

— На, вось табе, будзеш зімой лускаць і дзякаваць бабулі-яліне...

Яна змаўкала, збіраючыся крыху падрамаць. Але тут налятаў халодны вецер-сівер. Ён трос яе, выкручваў скурчанае ад старасці і холаду голле і ўзнімаў такі свіст і трэск, што спуджаная вавёрка зашывалася ў сваё дупло і не дыхала, быццам яе там і не было.

— Шалёны,— адмахвалася старая яліна,— адкуль цябе прыгнала!

— Ой, цётухна, адкуль прыгнала, не пытай. Скажы лепей, куды гоніць! — рагатаў вецер.

— Ведаю ўжо. Ляці сваёй дарогай.

Сівер узмахваў доўгім расхлістаным халатам, перакручваўся некалькі разоў у паветры і імкліва знікаў — гэтак, як і прыляцеў.

— Ох, скруціць ён галаву гэтай каліне! Вунь як яна хіліцца, ледзь не да самай зямлі яму кланяецца...

Старой яліне з узгорка было добра відаць усё, што рабілася на ўзлессі.

І сапраўды, маладзенькая каліна яшчэ больш чырванела і харашэла, сустракаючы ветра.

— Ляцім са мною па свеце! — шаптаў ёй вецер-сівер.— Што ты тут бачыш, стоячы вунь ужо колькі год на адным месцы, усё пры гэтай дарозе?



все учебники на www.slovo.ws



— Людзі тут ходзяць і ездзяць...

— «Людзі ходзяць і ездзяць...» Ты паслухай, што кажа пра гэтых людзей старая яліна. Яны загубяць цябе, паламаюць твае рукі... А ягады твае — навошта яны ім?

— Не кажы так. Мае ягады лечаць людзей... У цябе няма сэрца, і ты не ведаеш, як гэта цяжка, калі яно баліць. А людзі ўмеюць варыць з маіх ягад лекі і лячыць імі сэрца...

— «Людзі», «лекі»... Навошта яны табе здаліся! Мы з табой... паляцім да такіх высачэзных гор, якіх ты і не сніла ніколі. І ты тады забудзеш пра гэты свой лес, пра гэту дарогу, на якую ты дзень і ноч глядзіш...

— І ніколі больш не вярнуся сюды?



все учебники на www.slovo.ws

— А чаго?

— Не, я не здолею... Я высахну і памру без свайго лесу,— плакала каліна.

— Ну, дык і заставайся тут! А мне няма часу з табой валаводзіцца. Не спадзявайся, каб я яшчэ лятаў да цябе...

Вецер-сівер узмахваў сваім халатам, пранізваў каліну смяртэльным холадам.

Каліна калацілася, дрыжала, і на зямлю чырвонымі ягадамі сыпаліся яе горкія слёзы.

— Пачакай, не пакідай мяне адну!..— стагнала наўздагон ветру каліна.

Але вецер ужо не чуў яе.

* * *

А калі настала зіма і ў лесе не было ўжо ніводнага зялёнага лісціка, ніводнай кветачкі, ішла гэтай самай дарогай, каля якой расла каліна, жанчына з маленькім хлопчыкам.

— Мамачка! — закрычаў хлопчык і запляскаў у далоні.— Зірні, зірні! — ягады!

Яны спыніліся.

— Гэта каліна, сынок. Бачыш, якая яна: зіма, мароз, а яна не баіцца.

— Можна сарваць?

— Толькі асцярожна. Не паламі галінак.



все учебники на www.slovo.ws

Хлопчык ірваў чырвоныя калінавыя ягады, клаў іх у сваю рукавічку і пяшчотна прыгаворваў:

— Не бойся, калінка-малінка. Мае ручкі не злыя. Галінак тваіх не паломяць, вяршалінкі не скрышаць. Толькі ягадкі сарвуць — маме на лякарства...

Так ён прыгаворваў і ўсё клаў і клаў у сваю рукавічку чырвоныя ягады. І каліна радавалася: ашукваў яе вецер, і яліна-казачніца памылялася. Добрыя ў чалавека рукі, разумныя...

Вось і канец гэтай лясной казцы. Той маленькі хлопчык захацеў назваць яе казкай пра калінавую рукавічку.

Ну што ж, няхай сабе рукавічка, няхай сабе калінавая...

Ашу́кваць — падманваць.

Валаво́дзіцца — наўмысна зацягваць вырашэнне якой-небудзь справы.

За́йздрасць — пачуццё незадаволенасці, жаданне мець тое, што маюць іншыя.

Здо́лець — змагчы, асіліць.

Свавольніца — гарэзніца, непаседа.



все учебники на www.slovo.ws

1. Хто з дзейных асоб твора вам асабліва спадабаўся? Чаму?

2. Прачытайце апавяданне да абзаца, у якім апісваецца сустрэча каліны з ветрам.

3. Дайце загаловак гэтай частцы.

4. Што гаварыла пра каліну старая яліна?

5. Прачытайце размову каліны з ветрам. Якім вы ўяўляеце сабе вецер з апісання Алены Васілевіч? Як пісьменніца яго называе?

6. Чаму каліна не паслухалася ветру? Аб чым сведчыць яе ўчынак?

7. Дайце назву прачытанай частцы.

8. Прачытайце апавяданне ад слоў: «А калі настала зіма...» і да канца. Як можна назваць гэтую частку твора?

9. Як аднесліся хлопчык і яго маці да каліны?

10. Ці збыліся прадказанні старой яліны і ветру-бяздомніка?

## Скорагаворка

Звала па маліны Марына Галіну,
Галіна Марыну звала па каліну.



все учебники на www.slovo.ws

# Жавароначкі, прыляціце...

*Уладзімір Ягоўдзік*

Жаўрукі — найпершыя пасланцы вясны. На Беларусь яны вяртаюцца з выраю ў сярэдзіне сакавіка. Сонца яшчэ не паспела злізаць снег. Раніцою і ўвечары кусаецца мароз. А жаўрукі пяюць ужо, звіняць над полем і лесам, над вёскамі і гарадамі, вітаюць прыход вясны.

Іх у дружнай жаўруковай сямейцы — чатыры родныя браты.




Не бойцеся, у апошняга з братоў зусім не страшныя рожкі. Проста ў яго на галоўцы тырчаць пярынкі. Імі не надта напалохаеш драпежнага ястраба. Але жаўручок, як расказваюць старыя



все учебники на www.slovo.ws

людзі, паднімаецца з саломінкаю ў неба і спявае: «Пайду ястраба біць! Пайду ястраба біць!»

Ды вось бяда — саломінка выпадае, і жаўрук каменем ляціць да зямлі. А па дарозе апраўдваецца: «Кій упаў! Кій упаў!..»

Цяжка жаўруку несці на малых крылах званочкі вясны. Але можна дапамагчы яму. Трэба папрасіць маму, каб яна напякла з цеста чубаценькіх птушак. Потым нядзелькаю выйсці на вуліцу, як мага вышэй падкідваць іх угору над сабою і спяваць:

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце!
Бо зімачка надаела,
Усе хлебушкі пераела!

Паспрабуй, мой маленькі сябар. І ты абавязкова, хоць на адну хвіліну, наблізіш прыход вясны-красны на родную зямлю.

? 1. Пра што новае, цікавае вы даведаліся з твора?

2. Як пісьменнік называе жаўрукоў? Чаму?

3. Якія словы спявае жаўрук? Знайдзіце ў тэксце.

4. Што робяць першыя пасланцы вясны?

5. Прачытайце, як можна прыблізіць вясну.



все учебники на www.slovo.ws

## Пралеска

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Прыгрэла сонейка.
На ўзлеску
Птушыны спеў
Чуваць здаля...
Стаіць і слухае пралеска,
Як ціха
Дыхае зямля.





1. Уявіце карціну, апісаную ў вершы. Што вы намалюеце?
2. Як вы разумееце выраз «дыхае зямля»?
3. Вывучыце верш на памяць.

## Скорагаворкі

Прывучыць сароку — адна марока,
Сорак сарок — сорак марок.

Прытуліў пілу Піліп, пілаваў паленне з ліп.



slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

# Красавік

*Клаўдзія Каліна*

Ці ведаеце вы, чаму ў красавіку так хораша і столькі красак?

Ды таму, што Красавік — Мастак.

Быў час, калі Красавік першы раз прыйшоў на зямлю. Не спадабаліся яму пажоўклая пасля зімы трава, шэрае неба, чорная зямля. І вырашыў ён усё-усё перафарбаваць.

Узяў Красавік фарбы і пэндзаль і перш-наперш размаляваў неба ў сіні-сіні колер, а на ім аблокі. Затым перамаляваў палі. Дзе зялёнай, дзе жаўтаватай, дзе шэрай фарбай мазнуў. Лугі зрабіў ярка-зялёнага колеру, а на тых лугах-мурагах давай пырскаць то жоўтай, то белай, то ружовай фарбамі...

— Ну, а цяпер падамся ў лес,— сказаў Красавік,— пагляджу, што там трэба падмаляваць.

І рушыў у лес.

— Эге-гэ-гэ! — загукаў ён.— Сосны, яліны! Вольхі, асіны! Дубы, ясені! Ліпы, клёны, бярозы! Усе, хто можа, ідзіце да мяне.

І пайшлі да Красавіка дрэвы, а ён каму чырвоны ствол намалюе, каму жаўтаваты, каму карычневы, шэры, чорны, серабрысты... Амаль усе фарбы вымаляваў, аж стаміўся. А тут прыбегла



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

да яго бярозка, задыхалася, ледзь стаіць. Глянуў Красавік, а ў яго толькі адна белая фарба засталася.

— Будзеш белая,— кажа ён бярэзінцы.

— Няхай белаю, толькі не чорнаю. Не хачу быць чорнаю!

А да гэтага бяроза чорнаю была.

Пачаў Красавік фарбаваць бярозу ў белы колер, але фарбы не хапіла, дык сям-там чорныя лапінкі засталіся.

Адышоўся, глянуў на сваю работу: стаіць сярод сосен ды ялін белая-бялюткая бярозка, нібы тая дзяўчынка ў белай сукеначцы.

І такая яна прыгожая, што Красавік ажно засмяяўся. Адклаў ён убок пэндзаль, выразаў з вербалозу дудку, сеў пад бярозаю ды зайграў.

І так прыгожа, што аж слёзы пакаціліся.

І цяпер здараецца вясною: сядзіць Красавік пад бярозкаю і іграе на дудачцы. Прыйдзіце ў вясновы лес, прыслухайцеся, можа, і сустрэнецеся з Красавіком. І на бярэзінку паглядзіце. Стаіць яна, апусціла галінкі, слухае песню Красавіка, і часам капне на зямлю празрыстая бярозавая слязінка.

Але бярозавыя слёзы не салёныя, а салодкія, бо плача яна не ад гора, а з радасці.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

1. Як мяняецца прырода ў красавіку? Прачытайце.

2. Чаму пісьменніца называе Красавік Мастаком?

3. Перачытайце твор, звярніце ўвагу, як апісана прыгажуня бярозка.

4. Якія славесныя карціны можна стварыць да апавядання?

5. Падрабязна перакажыце апавяданне.

### Прыказкі

Прыйдзе пара — будзе трава.

Жаваранак прылятае на праталіну,
шпак — на прагаліну, жораў — з цяплом,
ластаўка — з лістом.

### Усход сонца

*Якуб Колас*

На ўсходзе неба грае
Пераліўным блескам,
Сыпле золата над гаем
І над пералескам.



все учебники на www.slovo.ws

Чуць-чуць дрогне, пралiецца
Чырвань на ўсходзе —
Гэта неба ўсмiхнецца
Людзям i прыродзе.

1. Зрабiце слоўны малюнак да верша.
2. Як вы разумееце выразы: «неба грае пералiўным блескам...», «сыпле золата над гаем...», «неба ўсмiхнецца»?
3. Вывучыце верш на памяць.

SLOVO.WS

## Пасадзіце рабінку

*Рыгор Ігнаценка*

Той чалавек, які не пасадзіў ніводнага дрэўца, дарэмна жыццё пражыў. Так вучыць мудрая народная прымаўка.

Але чаму я раю пасадзіць рабінку, а не бярозку альбо клёнік ці ліпку?

Можна, вядома, і іншыя дрэўцы пасадзіць. У мяне, напрыклад, ёсць каля дома і бярозка, і елачка, і асінка.

Дык вось паслухайце, чаму я раю менавіта рабінку пасадзіць.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Вясною гэта дрэўца адно з першых распускаецца. Наўкол яшчэ шмат якія дрэвы голыя стаяць, а яно ўжо тонкімі карункамі каля дома зелянее.

А як прыгожа цвіце рабіна! Па зялёнай кроне белымі шапкамі раскіданы пышныя суквецці. Прыемны водар ад іх за вярсту чуцён.

У канцы лета, калі ўсё ў прыродзе пачынае блякнуць і губляць сваю пышную прыгажосць, раптам пад акном успыхне рабіна. Загарыцца чырванню полымя і прамяніцца не згасаючы. І вось часам спыніцца які-небудзь прахожы і падзівіцца:

— Харасство якое!

Восенню каля вашага дома ўвесь час будуць трымацца розныя птушкі — шпакі, дразды, снегіры. На дрэўцы яны будуць ласавацца сакавітымі ягадамі, дзякаваць звонкімі галасамі гаспадару за смачны пачастунак.

Калі лісце на дрэвах ападзе, на рабінцы доўга яшчэ будуць чырванець гронкі ягад, звычайна аж да самага снегу.

Не здзіўляйцеся, калі да вас завітаюць стары дзядок або бабулька, якія ўжо не могуць хадзіць далёка ў лес. Яны папросяць ягад на лекі.

Пасадзіце, дзеці, сабе рабінку, не пашкадуеце. А як гэта лепей зрабіць, думаю, вам кожны дарослы дапаможа.



все учебники на www.slovo.ws

**Во́дар** — пах.

**За вярсту́** — далёка (вярста — мера даўжыні, роўна 1 км 60 м).

**Кару́нкі** — узоры.

**Сукве́цці** — спалучэнне кветачак.

1. Чаму пісьменнік раіць пасадзіць менавіта рабінку, а не іншае дрэва?
2. Прачытайце, як апісана рабінка.
3. Растлумачце сэнс народнай прымаўкі, дадзенай у пачатку твора.

## Прыказкі

Работа славіць чалавека.

Садок садзіць — жыццё харашыць.

Садзі сады і ў маладосці, і ў старасці.

Дзе няма ахвоты, там няма работы.

Хочаш добра жыць — павінен працу любіць.

Хто працуе, таму і шанцуе.



SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## Будзь верны!

*Пятрусь Броўка*

Увесь, як ёсць, да кроплі сілы
Бацькам, цябе што нарадзілі,
Будзь верны!
У дзень пагодны і ў навалу
Зямлі, цябе што ўзгадавала,
Будзь верны!
Палям, узгоркам і лагчынам,
Шляхам, дарожкам і сцяжынам
Будзь верны!
Барам, галля зялёным хвалям,
Табе прытулак што давалі,
Будзь верны!
Азёрам, рэчкам-чараўніцам
І той, з якое п'еш, крыніцы
Будзь верны!..



Л а г ч ы́ н а — нізкае месца, нізіна.
Н а в а́ л а — нашэсце ворага, напад.

1. Як вы разумееце заклік паэта: «Будзь верны!»?



slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

2. Што трэба рабіць, каб застацца назаўсёды верным бацькам і сваёй зямлі?
3. Ці можна быць верным сваёй прыродзе?
4. Навучыцеся выразна чытаць верш.

## Прыказкі

Родная зямелька як зморанаму пасцелька.

Усякая птушка сваё гняздо бароніць.

## Паразважайце над пытаннямі

1. Якія творы прысвечаны восені?
2. Чаму гэтая пара падабаецца паэтам?
3. Якія вершы вы запомнілі?
4. У чым чароўнасць зімы? У якіх творах вы прачыталі пра гэта?
5. Чаму рукавічку назвалі «калінавай»?
6. Як сустракаюць на Беларусі вясну? У якіх творах пра гэта гаворыцца?



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

# З усмешкай і ўсур'ёз



SLOVO.WS

все учебники на www.slovo.ws



все учебники на www.slovo.ws

## Чатыры пажаданні

*Васіль Вітка*

Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей.
Раніцай:
— Добрага ранку!
І апаўдня:
— Добры дзень!

Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць:
— Добры вечар!
І соннаму сонейку нанач,
І ўсім добрым людзям:
— Дабранач!

SLOVO.WS

1. Што можна сказаць пра аўтара верша «Чатыры пажаданні»? Які ён чалавек?

2. Пералічыце ветлівыя словы з гэтага верша.

3. Ці ўжываеце вы іншыя ветлівыя словы? Якія? Калі?

все учебники на www.slovo.ws



все учебники на www.slovo.ws

## Добры чалавек

*Павел Місько*

Шмат у лесе дзічак — і груш, і яблынь. Ідзеш-ідзеш, і раптам стомленае вока як не ўзрадуецца. Без усякай маскіроўкі, не трэба і прыглядвацца, ляжаць пад дрэвам яблыкі...

Сустракаю ў лесе знаёмую бабулю Веру. Нагрузілася, як мурашка: у адной руцэ кіёк і торбачка, а ў другой — перагароджаная папараццю на дзве палавіны лубянка. У адной палавіне грыбы, у другой — грушы і яблыкі. На спіне напакавала нечым заплечны мяшок. Не бабуля — турыстка!

— А-а, і ты тут,— узрадавалася яна, убачыўшы мяне.— Не трэба з лесу ісці з пустымі рукамі. От я і нясу ўсяго... Давай пройдзем крыху ды сядзем, адпачнем.

Ідзём, гамонім. Бабуля азіраецца кругом, нешта ўсё выглядае.

— Ну, вось тут і прысядзем,— гаворыць яна і апускаецца на траву.— На, пакаштуй... Не махай рукамі, не аднеквайся: ты такія не еў...— і падае яна мне дзве грушы.

Смакую. І праўда, адна лепшая за другую. І сок смачны, і каменьчыкаў амаль няма.



все учебники на www.slovo.ws

— А паляжыць — за вушы не адцягнеш. Ого — грушка-гнілушка, ды яшчэ лясная... Унукі мае прыгаршчамі іх цярэбяць. Іх і сушыць можна. А які кампот смачны з яблык-дзічак! І павідла з іх, і варэнне можна рабіць. Ну, а цяпер пакаштуй во гэту...

Трэцяя груша была як садовая. Мо бэра, мо вінёўка.

— А цяпер во гэты яблычак...— падала мне бабуля вялікі, з курынае яйка, яблык.

— Штрыфель?! — пазнаў я па смаку.— Але пахне незвычайна, як мёдам. На дзічку і не падобны.

— А гэта і не дзічка. Быў такі чалавек у нашым сяле — Захарка. Капаў у лесе дзічкі, у сады пераносіў, прышчэпліваў. Вельмі смачныя яблыкі, калі прышчэпліваць да лясных. А потым стаў па лесе хадзіць, дзе маладзенькую грушу ці яблыньку сустрэне — зрэжа, прышчэпіць. Дзе старэйшую — то галінку ці дзве прышчэпіць. Знойдзеш цяпер такое дрэўца — як падарунак на свята.

— Помнік сабе чалавек зрабіў...— кажу я.

— Але, каторы год, як яго няма, а людзі ўсё дзякуюць чалавеку. Дабро — яно жывучае. А цяпер паглядзі назад!

Я азірнуўся. На паляну схілілася Захаркава яблыня. Дзве галіны на ёй былі незвычайныя —



все учебники на www.slovo.ws

на адной яблыкі былі белыя, як папера, на другой — жоўта-аранжавыя, сплюшчаныя, як рэпкі.

Мы падышлі бліжэй.

— Як сонца... Налілася проста... Залаты ранет,— сказала бабка Вера.

Твар яе свяціўся, нібы не Захарка, а яна стварыла гэты цуд.

Г а м а н í ц ь — размаўляць.
Л у б я́ н к а — ручны караб, кошык.
П а к а ш т а в а́ ц ь — паспрабаваць ежу.
С т о́ м л е н ы — зморaны, абяссілены.
Ц я р э́ б я ц ь — *тут:* ядуць.

1. Ці спадабаўся вам Захарка? Чым?

2. Як людзі называлі дрэўцы, што прышчэплівáў Захарка?

3. Знайдзіце і прачытайце, як апісваецца Захаркава яблыня.

4. Як вы разумееце выразы: «Дабро — яно жывучае», «Помнік сабе чалавек зрабіў»?

5. Якой вы ўяўляеце бабулю Веру? Апішыце яе словамі.

6. Растлумачце назву твора. Як інакш яго можна назваць?



все учебники на www.slovo.ws
SLOVO.WS

7. Як пісьменнік Павел Місько адносіцца да бабулі Веры, да Захаркі? Адкажыце, спасылаючыся на тэкст.

## Касманаўт

*Клаўдзія Каліна*

Аўтобус, якім мы ехалі ў раённы цэнтр, вельмі часта спыняўся, падбіраў усё новых пасажыраў. Час цягнуўся марудна, стаяла летняя гарачыня, і дарога здалася ўсім цяжкай і доўгай.

Нарэшце паказаліся першыя будынкі пасёлка. Пасажыры з палёгкай уздыхнулі. Але нечакана шафёр затармазіў, ды так рэзка, што людзі, якія стаялі, паваліліся адзін на другога.

— Што там такое? — пачуліся незадаволеныя галасы.

Пасярод дарогі стаяла жанчына без хусткі, з раскудлачанымі валасамі. Гэта яна спыніла аўтобус. Побач на абочыне дарогі сядзеў хлапчук гадоў васьмі, босы, у трусах і майцы, і толькі праз меру вялікая галава яго была абвязана цёплай хусткай да самых вачэй. Жанчына схапіла хлап-



все учебники на www.slovo.ws

чука за руку і пацягнула да адчыненых дзверцаў аўтобуса.

— Ну, лезь хутчэй! — груба штурханула яна малога.

Але той спыніўся ля самых дзверцаў і, як сляпы, пачаў намацваць прыступку. Нехта з пасажыраў падхапіў хлопчыка за руку і памог увайсці ў аўтобус, які адразу ж крануўся з месца.

— Навошта яму памагаць, узлезе і сам! — замест падзякі сярдзіта сказала жанчына і пачала папраўляць валасы.

Пасажыры здзіўлена пераглянуліся.

— Што гэта за маці такая? — пачулася ціхае здзіўленне.— Дзіця хворае, а яна крычыць на яго ды яшчэ ў плечы таўчэ...

— Не маці, а, напэўна, мачыха,— зазначыў стары дзед і пасунуўся, каб даць месца малому.— Ідзі, унучак, сядзь са мною...— запрасіў ён.

Але хлопчык прытуліўся галавой да жанчыны і жаласна захныкаў.

— Ну садзіся ўжо! — строга загадала жанчына малому і, павярнуўшыся да пасажыраў, дадала: — Не хвалюйцеся, людзі добрыя, не хворы ён... А дома я яму яшчэ не так усыплю. Будзе ведаць, як ад працы адрываць. Самае жніво, работы столькі ў калгасе, а ён... Насіся тут


все учебники на www.slovo.ws



з ім! — Жанчына ў злосці пляснула далоняй па вялізарнай хлапчуковай галаве. Пачуўся глухі звон.

— Давай развяжу, а то задыхнешся,— ужо больш лагодна сказала яна і пачала развязваць хустку на хлапчуку.



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

Ад цікаўнасці пасажыры нават падняліся са сваіх месцаў, каб лепш убачыць, што такое з малым.

Хлапчук не даваўся, трымаючыся рукамі за галаву. Але маці сцягнула хустку з сына:

— Вось, калі ласка, палюбуйцеся!

На галаве малога быў круглы чорны чыгун, і толькі з выбітай шчыліны выблісквалі жывыя дзіцячыя вачаняты.

— У-у-у! — загуло ўсярэдзіне чыгуна, і хлапчук зноў уткнуўся ў матчын фартух.

— Сціхні! Чуеш? Вось прыедзем у бальніцу, там табе знімуць твой шлем. Выдумаў сам сабе на бяду. Цяпер маўчы.

Пасажыры стрымана заўсміхаліся. Ніхто не адважваўся вясёлым рогатам пакрыўдзіць цярплівага пакутніка.

Аўтобус спыніўся якраз насупраць амбулаторыі. Жанчына з хлапчуком выйшлі. А за імі высыпалі і ўсе астатнія пасажыры. Праз адчыненае акно амбулаторыі было відаць, як у прыёмным пакоі доктар пстрыкнуў пальцамі па чыгуну і весела сказаў, заглядваючы ў шчыліну:

— Што, браток, надзець змог, а зняць не можаш? Ну, нічога, здымем. Пацярпі...

Ён падышоў да дзвярэй і гукнуў:



все учебники на www.slovo.ws

— Данілавіч! Ідзі сюды. Гэта па вашай часці...

На парозе прыёмнага пакоя паявіўся вусаты санітар. Ён пакруціў галавой, пацмокаў языком, узяў хлопчыка за руку і павёў за сабой.

Пасажыры не разыходзіліся. Усе быццам забыліся пра свой клопат. Кожнаму было цікава, як жа ўсё скончыцца.

Неўзабаве на ганак выскачыў наш герой. Увесь спацелы, перамазаны сажай, ён трымаў у руках дзіравы чыгун.

Хлапчук вінавата азірнуўся. Бачачы, што ён ніяк не можа расстацца са сваім злашчасным «шлемам», маці выхапіла чыгун з яго рук і шпурнула ў прыдарожную канаву. Вусаты санітар выйшаў на ганак.

— Ну і цярплівы ж...— задаволена сказаў ён.— Гэтак я яго прыціснуў, аж самому горача стала, а ён хоць бы што — толькі сапе... Такі, напэўна, будзе гэтым... як яго...

— Касманаўтам! — у адзін голас падказалі пасажыры і пайшлі садзіцца ў аўтобус.

Амбулато́рыя — лячэбніца.

Лаго́дна — мякка.

Паку́тнік — чалавек, які церпіць пакуты.



все учебники на www.slovo.ws

1. Вы спачувалі хлопчыку ці смяяліся з яго?

2. Якой вы ўяўляеце маці хлопчыка? Ці правільнае было першае ўражанне аб ёй у пасажыраў?

3. Ці спадабаўся вам хлопчык? Чым?

4. Перачытайце апавяданне моўчкі.

5. Перакажыце апавяданне па плане:

1. Паездка ў горад.
2. Сустрэча на дарозе.
3. Паводзіны маці.
4. Абурэнне пасажыраў.
5. Чыгун на галаве.
6. Хуткая дапамога.
7. Касманаўт.

SLOVO.WS

## Правініўся

Вова прыйшоў са школы раней, чым звычайна.

— Што, зноў правініўся? — пытае маці.

— Настаўніца сама вінавата. Яна сказала: паводзьце сябе як дома. Я так і паводзіў сябе. І яна адправіла мяне дамоў.

Як Вова паводзіў сябе ў класе?



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

## Дапамажыце!



Складзіце па малюнках апавяданне.



все учебники на www.slovo.ws

## Хлопчык і кацянё

*Эдуард Валасевіч*

Ёсць людзі добрыя, ёсць людзі злыя...
Напэўна, хтосьці з чорнаю душой
Укінуў ранняю вясной,
Калі імчалі крыгі ледзяныя,
У ваду сцюдзёную малое кацянё,
І плакала яно, як дзіцянё:
— Мяў! Мяў! Ратуйце! Мяў, дапамажыце!
Мне холадна, баюся я вады...
— О, бедненькі!..— усклікнуў хлопчык Міця.—
Трымайся, брат! Я выручу з бяды!
І мігам
Ён скочыў з берага на крыгу
І кацянё малое ўратаваў.
Мне скажуць: — Міця так рызыкаваў...
Мажліва.
Затое ён расце адважны і чуллівы,
Таварыша ў бядзе —
Не падвядзе!

Р ы з ы к а в á ў — ставіў сябе пад пагрозу.
Ч у л л í в ы — уважлівы да людзей, сардэчны.



все учебники на www.slovo.ws

1. Паразважайце над учынкам Міці. Чаму ён уратаваў кацянё?

2. Якія рысы характару мае Міця?

3. Ці можа хлопчык быць добрым сябрам? Чаму вы так думаеце?

4. Як вы разумееце выраз: «хтосьці з чорнаю душой укінуў... у ваду сцюдзёную малое кацянё»?

5. Успомніце або прыдумайце прыказку пра сяброўства.

6. Вывучыце верш на памяць.

SLOVO.WS





все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

## Сівая валасінка

*Васіль Сухамлінскі*

Міхась убачыў у матчынай касе тры сівыя валасінкі.

— Мама, у вас у касе тры сівыя валасінкі,— сказаў ён.

Мама ўсміхнулася і нічога не адказала.

Праз колькі дзён Міхась глянуў на матчыну касу і ўбачыў у ёй чатыры сівыя валасінкі.

— Мама,— сказаў Міхась са здзіўленнем,— у вас у касе чатыры сівыя валасінкі... А было ж толькі тры. Чаму ж пасівела яшчэ адна?

— Ад болю,— адказала мама. — Калі баліць матчына сэрца, тады і валасінка сівее.

— А ад чаго ж у вас сэрца балела?

— Памятаеш, ты палез на высознае-высознае дрэва... Я зірнула ў акно, убачыла цябе на тоненькай галінцы. Сэрца забалела, і валасінка пасівела...

Міхась доўга сядзеў задумлівы, маўклівы. Потым ён падышоў да маці, абняў яе і паціху спытаўся:

— Мама, а калі я на тоўстай галіне буду сядзець — валасінка не пасівее?



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

1. Што ўбачыў Міхась?

2. Чаму ў мамы з'явіліся новыя сівыя валасінкі? Знайдзіце адказ у тэксце і прачытайце.

3. Як мама растлумачыла Міхаську з'яўленне сівых валасінак? Ці зразумеў яе хлопчык?

4. Падумайце і адкажыце сваімі словамі, што трэба рабіць, каб не сівелі валасы ў маці.

## Размова

— Мама, давай пагуляем з табою.

— Я, сынку, занята. Трэба кончыць працу.

— А мне сумна.

— А ты знайдзі сабе занятак, тады і сумаваць не будзеш.

Прыдумайце да гэтай размовы прыказку.

## Прыказкі

Матчыны рукі заўсёды мяккія.

Пры сонейку цёпла, а пры маці добра.



все учебники на www.slovo.ws

## Маміны рукі

*Паўлюк Прануза*

Маміны рукі самыя лепшыя:
Няньчылі, гушкалі, лашчылі першыя.
Маміны рукі сардэчныя, смелыя,
Маміны рукі самыя ўмелыя.
Маміны рукі — рукі шчаслівыя.
Маміны рукі заўсёды цярплівыя.
Маміны рукі самыя светлыя,
Маміны рукі самыя ветлыя.

В е́ т л ы я — ласкавыя, прыветныя.

1. Якімі словамі апісвае паэт рукі маці? Знайдзіце іх і прачытайце.
2. Растлумачце, як вы разумееце выразы: «рукі сардэчныя, смелыя», «рукі шчаслівыя», «цярплівыя», «ветлыя».
3. Вывучыце верш на памяць.

### З а г а д к а

У дзвюх матак па пяць хлапчанятак, на кожнага адно імя.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## А таму!

*Мікола Янчанка*

Змітрок, Валодзя і Маня ў лес ідуць. У грыбы, мусіць. Ромка таксама ўхапіў кошык ды на вуліцу:

— І мяне вазьміце!

— Хадзем,— кажа старэйшы, Змітрок.— Што нам — лесу шкада, ці што? Толькі не адставай ад нас. Каб не згубіўся часам.

— Добра,— паабяцаў Ромка,— не адстану.

Да лесу рукой падаць. Збеглі ў лагчынку, перайшлі па кладцы рэчку — у алешнік. А за алешнікам на ўзгорачку сасоннік, у якім дзе-нідзе бярозкі трапляюцца. Унізе ж малады ельнік. Самы баравіковы лес!

Усе прама пайшлі. А Ромка бачком, бачком ды налева. Рашыў прабегчы па тых мясцінах, дзе яны з бацькам раней былі. Вось і знаёмая канаўка паўз дарогу. Ромка адразу крок прыцішыў, прыгнуўся крыху, пачаў уважліва заглядваць пад елачкі ды разграбаць прыўзнятыя лісточкі. І аж уздрыгнуў ад нечаканасці: з-пад лапак выглядаў каранасты прыгажун баравік. Ромка палюбаваўся ім, не спяшаючыся зрэзаў і паклаў у кошык. Ступіў некалькі крокаў — яшчэ адзін, азірнуўся вакол — трэці, чацвёрты!



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

А дзесьці ў глыбіні лесу крычалі Змітрок, Валодзя і Маня. Яго клікалі. Але Ромка не адгукнуўся. «Яшчэ сюды прыбягуць і мае баравікі пахапаюць»,— думаў ён...

Галасы Змітрака, Валодзі і Мані сталі ледзь чутныя. Ромка спалохаўся і пабег да сяброў.

— Дзе гэта ты быў? — незадаволена сустрэў яго Змітрок.— Мы ўсе ногі пазбівалі, цябе шукаючы.

— Заблудзіўся я,— зманіў Ромка і апусціў долу вочы.— Адышоўся ад вас і заблудзіўся.

Падбеглі Валодзя і Маня.

— А мы цябе шукалі, шукалі,— пачала сыпаць Маня.— Думалі ўжо ў вёску бегчы ды старэйшых клікаць...

— Дадому час,— спыніў яе Змітрок і звярнуў на дарогу.

Ромку было няёмка перад сябрамі. Ён ішоў за імі, апусціўшы галаву. Але настрой яго адразу ўзняўся, калі яны ўвайшлі ў вёску.

— Глядзі ты,— дзівіліся сустрэчныя,— такі малы, а поўны кошык баравічкоў накалупаў. А ты, Змітрок, пэўна, варон лічыў. Толькі дно закрыў.

Хацеў Змітрок сказаць, што не да баравікоў яму было, што весь гэтага Ромку шукаў, ды змаўчаў.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Назаўтра Ромка сам да Змітрака пайшоў. Там Валодзю і Маню застаў. З кошыкамі.

— І я з вамі! — гукнуў Ромка.

— Не,— панура адказаў Змітрок,— мы цябе з сабой не возьмем.

— А чаму?

— А таму! — адказаў за Змітрака Валодзя.

Д о́ л у — уніз.

М у́ с і ц ь — магчыма.

Н я ё м к а — непрыемна, цяжка.

Ш к а д а́ — жаль.

Перакажыце тэкст па плане:

1. Куды збіраліся ісці Змітрок, Валодзя і Маня?
2. Хто папрасіўся ісці з імі разам?
3. Як паводзіў сябе Ромка ў лесе?
4. Чаму толькі адзін Ромка набраў цэлы кошык баравікоў?
5. Чаму дзеці не ўзялі другі раз Ромку з сабой у лес?

**П р ы к а з к а**

Не май сто рублёў, а май сто сяброў.



все учебники на www.slovo.ws

## Будзень і Свята

*Расціслаў Бензярук*

Яны сустрэліся на дарозе. Ён — у саламяным капелюшы, лапцях, з клуначкам за плячамі. Яна сядзела ў брычцы, запрэжанай параю коней, маладая і прыгожая.

Ён пакланіўся паненцы, і тая звярнула на падарожнага ўвагу:

— Хто ты? Куды ідзеш?

— Будзень я. Іду куды вочы глядзяць.

— А, цябе прагналі з сяла! — засмяялася паненка.

Ён здзіўлена паглядзеў на яе:

— Адкуль ты ведаеш?

— Я — Свята! — з гордасцю пахвалілася паненка.— Калі людзі запрашалі, я сказала, што прыйду, як цябе прагоняць.

— Ах, вось чаму ўсе раптам сталі няветлівымі! — здагадаўся Будзень.— Нават у дарогу нічога не далі.

— Ідзі-ідзі і не вяртайся! — сказала, як загадала, Свята.— Я надоўга прыехала, можа, і назаўсёды.

— Але ці можна жыць, калі кожны дзень — Свята? — засумняваўся Будзень.



все учебники на www.slovo.ws

— Можна! — зарагатала паненка і тузанула за лейцы.

Брычка ўехала ў сяло. Свята голасна заспявала:

— Кідайце, людзі, граблі, косы —
Свята едзе ў госці!

Людзі пабеглі насустрач.

Свята злезла з брычкі, агледзелася:

— А чаму няма гармоніка? Дзе дуда?

Паслалі па музыкаў, а самі хуценька пачалі сталы расстаўляць, стравы насіць. Госцю на покуць пасадзілі. З'явіліся музыкі. І развесяліліся людзі, пайшлі ў скокі.

— Як жа мы раней жылі? — здзіўляліся яны.— Усё праца ды праца.

Дзень весяліліся, пяць, месяц, аж бачаць — на сталах і ў каморы пуста. Што піць, есці? Задумаліся людзі.

— Трэба за працу брацца,— сказаў адзін са старэйшых.— Інакш з голаду памром.

— Але ж у нас Свята! — запярэчылі астатнія.— Пры такой госці мы не прывыклі працаваць. Дый Будзень невядома дзе.

— Трэба знайсці яго і папрасіць, каб вярнуўся ў сяло.

Тым часам Будзень, пахадзіўшы па свеце, дамоў ідзе. Людзі кінуліся насустрач:



все учебники на www.slovo.ws

— Як ты дазнаўся, што нам цяжка?

— Хто доўга гуляе, той багацця не мае! — адказаў Будзень.

Пачула гэта Свята, кінулася да брычкі і наўскач пагнала коней.

А людзі цяпер у будзень працуюць, сіл не шкадуючы, а прыйдзе свята — гуляюць. Толькі надоўга ў госці свята ўжо не прыходзіць.

**Бу́дзень** — працоўны дзень, напрыклад, панядзелак.

**Бры́чка** — лёгкі выязны вазок.

**Пане́нка** — маладая дзяўчына.

**По́куць** — вугал пад абразамі.

1. Хто сустрэўся на дарозе?
2. Як выглядаў Будзень, а як Свята?
3. Чым выхвалялася Свята? Якую песню яно спявала?
4. Раскажыце, як людзі сустракалі Свята.
5. Чаму яны пачалі зноў працаваць?
6. Знайдзіце ў тэксце прыказку і растлумачце яе.
7. Падзяліце казку на часткі. Дайце ім загалоўкі. Коратка перакажыце казку.



все учебники на www.slovo.ws

# Ці так чытала?

*Мар'ян Дукса*

Так чытала,
так гартала,
аж пакуль цямнець не стала.
З кніжкай ела,
з кніжкай спала,
з кніжкай бегала нямала.
З ёй у сад хадзіла я,
з ёй была ля ручая,
з ёй сядзела рана-рана
ля блакітнага экрана.
Нават
кнігі не закрыла.
Так вучыла,
так гартала —
толькі тройку атрымала.
Можа,
я не так чытала?



1. Што вы скажаце дзяўчынцы — ці так яна чытала?
2. Якія словы ўказваюць на дзеянні дзяўчынкі (чытала, гартала...)?
3. Якіх якасцей характару ёй не хапае?



все учебники на www.slovo.ws

## Сустрэча

*Іван Вярыга*

Усе дзеці са школы пайшлі дарогай, а Саўка — нацянькі. Што яму! Праз новыя глыбокія галёшы вады не набярэш, а балота ён па жардзінках пройдзе, не зваліцца.

«Прыйду дамоў,— радаваўся хлопчык,— і адразу скажу тату: — Бяры заўтра мяне на паляванне. Пяцёрка па матэматыцы. Ды якая! Па кантрольнай».

Жардзінкі аказаліся слізкімі ад ільду, і Саўка быў ужо не рад, што пайшоў сюды. Асцярожна ступаючы і балансуючы рукамі, ён павольна прасоўваўся ўперад. Раптам ля самага канца балаціны насустрач Саўку выскачыў суседскі сабака Тузік, з якім ён часта дурэў.

— Чаго цябе панесла сюды? Дарогі не ведаеш, ці што? — узлаваўся хлопчык.— Ага! Ніяк назад не павернешся. Вось цяпер і лезь у гразь. Бачыў, што я іду,— пачакаць трэба было.

Тузік вінавата глядзеў хлопчыку ў вочы.

— Ну, давай назад! — загадаў Саўка.

Сабака матнуў галавой і ўздрыгнуў усім целам.

— Ведаю, як табе не хочацца лезці ў гразь, але нічога не зробіш,— ужо больш лагодна



все учебники на www.slovo.ws

сказаў хлопчык.— Мне ніяк нельга вяртацца. Тады я тату дома не застану, ды і з кладкі злязецць можна. Я ледзьве сюды дабраўся.

Тузік, нахіліўшы галаву, уважліва слухаў, быццам разумеў кожнае слова.

— Ну, чаго вушы развесіў? — павысіў голас Саўка.— Давай! А то вазьму і скіну.

Хлопчык выставіў наперад рукі. Тузік прысеў на заднія лапы і жаласна заскавытаў.

Саўка задумаўся на хвіліну, уздыхнуў і рашуча ступіў у гразь.

Тузік завіляў хвастом і пабег далей па жардзінах.

— Глядзі ж, не зваліся! — крыкнуў яму наўздагон Саўка.

Ледзяная брудная вада адразу прасачылася ў чаравікі, і, каб хутчэй выбрацца на сухое, хлопчык пашлёпаў па гразі, ужо не выбіраючы дарогі.

Дома Саўка сказаў бацьку:

— Шкада мне яго стала. Сам падумай: я магу пераабуцца. На печы сагрэцца, а Тузік усю ноч будзе трэсціся ў халоднай будцы. Яшчэ захварэе.



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

1. Раскажыце, як Саўка сустрэўся з Тузікам.

2. Чаму Саўка ступіў у гразь?

3. Прачытайце, што хлопчык сказаў бацьку, калі вярнуўся дадому.

4. Што вы думаеце пра ўчынак Саўкі?

5. Што б вы зрабілі, калі б былі на месцы Саўкі? Чаму?

6. Прыдумайце працяг апавядання.

7. Ці ёсць у вас дома сабака? Раскажыце пра яго.

### Загадка

З людзьмі сяброе, хату вартуе, жыве пад ганкам, хвост абаранкам.





все учебники на www.slovo.ws

## Хлеб

*Барыс Сачанка*



Было гэта даўно. Адразу ж пасля вайны. У голад...

Маці прынесла аднекуль акрайчык хлеба. Доўга-доўга разглядала яго, нюхала, паварочвала і так, і гэтак, нібыта не верыла вачам сваім, што на далоні ў яе ляжыць хлеб — сапраўдны жытні хлеб.

Потым яна нейк, як мне падалося, аж надта борзда і неахайна разламала акрайчык напалам: адзін кавалак дала мне, а другі палажыла на стол, пад абрус.

— Гэта Толіку... Вернецца з лесу, то павячэрае...

Сама ж, узяўшы капаніцу, пайшла на агарод акопваць бульбу.

Я вельмі хацеў есці. І той кавалачак хлеба, што дала мне маці, з'еў, праглынуў мігам. І вядома, ані не наеўся, толькі раструдзіў яшчэ больш свой голад. Хвілін колькі я не мог нідзе знайсці сабе месца, чамусьці лазіў на печ, пад ложак, выбягаў на двор і зноў — каторы раз! — вяртаўся назад у хату. Потым усё ж не вытрымаў. Падсеў



все учебники на www.slovo.ws

да стала, адгарнуў абрус, узяў у сваю руку той кавалачак хлеба, што пакінула маці Толіку, майму старэйшаму брату. Не есці ўзяў. Проста так, паглядзець. Палюбавацца хлебам, як любавалася маці. І тады раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла, брату пакінула хлеба намнога больш, чым дала мне. Ад братавага кавалачка я адшчыпнуў крошачку. Толькі крошачку. Адну маленечкую, малюпасенькую крошачку. Укінуў яе ў рот. Пачаў жаваць. Калі пракаўтнуў, не заўважыў, як пальцы мае самі, не пытаючыся ў мяне на тое згоды, адшчыпнулі яшчэ крошачку. Маленечкую, малюпасенькую крошачку...

Схамянуўся я тады, калі на маёй далоні асталася абшчыпаная з усіх бакоў скарыначка. Што я нарабіў? Што скажуць маці, брат, калі вернуцца дахаты?..

Хуценька-хуценька я палажыў скарыначку на стол, акрыў яе абрусам. Але спакуса з'есці хлеб увесь, каб яго і духу не было ў хаце, каб ім і не пахла нават, была такая вялікая, такая неадольная, што я не вытрымаў — зноў падсеў да стала, узяў скарыначку ў рукі і ўкінуў яе ў рот...

Брат вярнуўся з лесу, як заўсёды, позна... Ён цэлы дзень быў на дзялянцы, абсякаў сучча, зарабляў грошы, каб было за што нашай сям'і жыць.



все учебники на www.slovo.ws
SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Дома есці ў нас не было нічога. І спаць брат лёг у той вечар галодны. Ён доўга варочаўся на пасцелі, не засынаў: няйнакш яму мроіўся той кавалачак хлеба, які пакідала яму маці і які з'еў я...

Ніхто — ні маці, ні Толік — ні ў чым мяне не папракнуў. Ні ў той вечар, ні пасля. Яны былі старэйшыя, я меншы.

Але калі я цяпер успамінаю той хлеб, які належала з'есці брату і які з'еў я, і той вечар, калі брат лёг праз мяне спаць галодны, мне робіцца не па сабе. Здаецца, аддаў бы ўсё, каб толькі не было ў мяне такога ўспаміну, каб як-небудзь пазбыцца, выкінуць яго са сваёй галавы. Лепей бы я быў тады галодны, лепей бы я лёг спаць не еўшы! Хай бы не я, а брат з'еў мой хлеб!..

Ды не! Таго, што было, не вернеш, не пераробіш. І з памяці сваёй, як бы ні хацеў, не выкінеш. Не, не выкінеш!

А б р у́ с — кавалак тканіны, якім засцілаюць стол.

Бо́ р з д а — хутка.

К а п а н і́ ц а — прылада для працы на агародзе.

М р о́ і ў с я — *тут:* бачыўся, уяўляўся ў думках, сніўся.



все учебники на www.slovo.ws

С п а к у́ с а — тое, што выклікае неадольнае жаданне.

С х а м я н у́ ц ц а — раптам успомніць пра што-небудзь.

❓ 1. Калі адбываліся падзеі, апісаныя ў апавяданні?

2. Чаму маці падзяліла хлеб на дзве, а не на тры часткі?

3. Што зрабіў хлопчык? Чаму гэты ўчынак хвалюе яго ўсё жыццё?

4. Чаму дарослыя не дакаралі малога?

5. Як трэба адносіцца да хлеба?





все учебники на www.slovo.ws

## Асілкі

*Іван Мурвейка*

З веку ў век асілкі жывуць.
Капаюць каналы і поле аруць.
Будуюць у тундры, тайзе гарады
І садзяць у жоўтай пустыні сады.
Багацці для нас дастаюць з-пад зямлі
І запускаюць да зор караблі.
З веку ў век два асілкі жывуць.
Вось яны, глянь. Іх рукамі завуць.

1. Прачытайце верш самі сабе.
2. Чаму паэт называе рукі асілкамі?
3. Якія пачуцці трэба выказаць пры выразным чытанні верша (цікавасць, захапленне, радасць, сум)?

### Загадкі

Маленькі работнік шмат гадоў працаваў, ніколі не спаў, толькі адзін раз працаваць перастаў — і навек прапаў.

За белым бярэзнічкам талалайка гудзіць.



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

## Паразважайце над пытаннямі

1. Якія творы раздзела вам найбольш спадабаліся, зацікавілі вас? Абгрунтуйце свой адказ.

2. Якія творы выклікалі ў вас усмешку? Вызначце найбольш цікавыя.

3. Якія мудрыя ўрокі вы атрымалі з дапамогай апавяданняў гэтага раздзела?

4. Якія творы вы чыталі ўсур'ёз? Чаму?

## Адгадкі

С. 6. Ніва. Ліст. Зерне.
С. 51. Бусел.
С. 67. Сняжынкі.
С. 107. Рукі, пальцы.
С. 117. Сабака.
С. 122. Сэрца. Зубы і язык.





все учебники на www.slovo.ws

## Змест

### З крыніц народных...

БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСНІ . . . 4
Адкуль песня беларуская . . . 4
**Абрадавыя песні** . . . . . . . . 4
**Жніўныя песні** . . . . . . . . . . 5
Жніўная . . . . . . . . . . . . . . . . 5
**Восеньскія песні** . . . . . . . . 7
Восень мая, восень... . . . . . . . 7
**Зімовыя песні** . . . . . . . . . . 8
Калядкі . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Наша Масленіца гадавая . . . . . 9
**Вясновыя песні** . . . . . . . . . 10
Жавароначкі, прыляціце . . . . . 10
**Купальскія песні** . . . . . . . . 12
А на Купалу... . . . . . . . . . . . . 12
**Лірычныя песні** . . . . . . . . . 13
Рэчанька . . . . . . . . . . . . . . . 13
**Жартоўныя песні** . . . . . . . . 15
Певунок . . . . . . . . . . . . . . . . 15
БАЙКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Чаму кот пасля яды мыецца . . . 17
Хто задзірае нос угору . . . . . . 18



все учебники на www.slovo.ws

ЛЕГЕНДЫ . . . . . . . . . . . . . . . 19
Адкуль узнік горад Мінск . . . . . . 19
Як узнікла назва Гомель . . . . . . . 20
БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ . . . . . 21
Каток — залаты лабок . . . . . . . . 22
Лісіца і Гусак . . . . . . . . . . . 26
Бацькоўскія парады . . . . . . . . . 28
Самае добрае . . . . . . . . . . . . 30
ЛІТАРАТУРНАЯ КАЗКА . . . . . . . . 32
Дружбакі. *Расціслаў Бензярук* . . . . 32
Усмешка. *Галіна Васілеўская* . . . . . . 36

## Мой родны кут! Як ты мне мілы...

Беларусь — мая Радзіма. *Артур Вольскі* 42
Чароўны край. *Зоська Верас* . . . . . 44
Твой род, твая Радзіма. *Васіль Вітка* . . . 46
Край мой. *Генадзь Бураўкін* . . . . . . 47
Мая Беларусь. *Паводле Уладзіміра Караткевіча* . . . . . . . . . . . . . . 49
Родная мова. *Артур Вольскі* . . . . . . 52
*** У нас хапае слоў такіх... *Юрась Свірка* 56
Шануйце ўсё жывое. *Уладзімір Дубоўка* 57
Ясныя дні восені. *Якуб Колас* . . . . . 60
Гусанькі. *Станіслаў Шушкевіч* . . . . . 62
Чараўніца. *Зоська Верас* . . . . . . . 64



все учебники на www.slovo.ws

Зіма. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . . . . . 65
Зімой. *Максім Багдановіч* . . . . . . . . . 67
Прыгожая лісіца. *Алесь Асіпенка* . . . . . 70
Калінавая рукавічка. *Алена Васілевіч* . . . . 73
Жаваронačкі, прыляціце... *Уладзімір Ягоўдзік* 80
Пралеска. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . . . 82
Красавік. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . . . . 83
Усход сонца. *Якуб Колас* . . . . . . . . . . 85
Пасадзіце рабінку. *Рыгор Ігнаценка* . . . . 86
Будзь верны! *Пятрусь Броўка* . . . . . . . . 89

## З усмешкай і ўсур'ёз

SLOVO.WS

Чатыры пажаданні. *Васіль Вітка* . . . . . . 92
Добры чалавек. *Павел Місько* . . . . . . . . 93
Касманаўт. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . . . . 96
Правініўся . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Хлопчык і кацянё. *Эдуард Валасевіч* . . . . 103
Сівая валасінка. *Васіль Сухамлінскі* . . . . 105
Размова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Маміны рукі. *Пайлюк Пpануза* . . . . . . . . 107
А таму! *Мікола Янчанка* . . . . . . . . . . 108
Будзень і Свята. *Расціслаў Бензярук* . . . . 111
Ці так чытала? *Мар'ян Дукса* . . . . . . . . 114
Сустрэча. *Іван Вярыга* . . . . . . . . . . . 115



все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

Хлеб. *Барыс Сачанка* .................. 118
Асілкі. *Іван Мураўейка* ................ 122

Загадкі ............... 6, 51, 67, 107, 117, 122
Прыказкі 9, 29, 48, 63, 85, 88, 90, 106, 110
Скорагаворкі ........................ 26, 79, 82

Адгадкі ........................................ 123

Тэматычныя малюнкі:
«Дружная сям'я» ...................... 35
«Что зрабіў мароз?» .................. 69
«Дапамажыце!» ....................... 102

SLOVO.WS



все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws